КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №6 (134)
◂ 20 ЛЮТАГА ◂ 2009 г.

# Новы Час



З ЛЮБОЎЮ І НАДЗЕЯЙ

Стар. 4

**ЛІБЕРАЛЬНА БЕРЦАМІ ПА НЫРКАХ**

З пачатку года па Беларусі пракацілася хваля «лібералізацыі». На Дзень любові 14 лютага яна ўвасобілася ў брутальным разгоне мірнай акцыі. Калі ацэньваць выказванні кіраўніцтва краіны, гэта — не выпадковасць.

Стар. 5

**КОД ПАПЫ**

Рашэння Папы Рымскага рэабілітаваць былога святара, які адмаўляе факт Халакосту, справакавала не толькі гучны скандал, але і прымусіла шмат каго задацца пытаннем: «Хто такі Бенедыкт XVI?»

Стар. 12

**МІНСК ВАРТЫ BUCHMESSE**

Уводзіны ў параўнальную букіністыку

Стар. 14–15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

Нарыс Марыі Мартысевіч

**«Дар'я Кастэнка»**

З цыклу «Новая генерацыя»

АД РЭДАКТАРА



# ДЗЕНЬ І ГОД ІРЫНЫ КАЗУЛІНАЙ

Аляксей КАРОЛЬ

**23 лютага 2008 года. Трагічны дзень для Ірыны Казулінай. Апошні дзень яе зямнога жыцця. Трагічны для яе мужа Аляксандра Казуліна, палітычнага змагара. Трагічны тым больш, што ён не мог быць побач з ёю, бо па несправядліваму прысуду знаходзіўся за калючым дротам калоніі. Трагічны для родных і блізкіх.**

І гэты дзень стаўся днём смутку і болю для тысяч людзей, што паверылі кандыдату ў прэзідэнты Аляксандру Казуліну ў яго імкненні змяніць жыццё краіны да лепшага. Паверылі ў тым ліку — а многія і найперш — дзякуючы Ірыне Казулінай.

Не, яна не была паплечніцай свайго мужа ў наўпроставым сэнсе гэтага слова: не займала ніякіх пасад ні ў яго перадвыбарчым штабе, ні ў партыі. Не выступала з прамовамі. Не ўплывала на рашэнні. Не пісала тэкстаў улётак і зваротаў. Сціпла трымалася ў баку.

Яна забяспечвала сямейны тыл. Але ж і не растварылася ў мужы, у дзецях, у сям'і. Яна была асобай, са сваім унутраным сусветам. Асобамі выраслі і дзве іх дачкі. Сям'я як супольнасць асоб, роднасных душ, дзе кожны — сусвет і кожны апора адзін аднаму.

Але ж і не заўважыць Ірыну Іванаўну было немагчыма: лёгкая, прыгожая, усмешлівая, з вялікімі выразнымі вачыма. Ад усёй яе постаці струменілася прыязнасць і добразычлівасць да людзей, як стан душы, што немагчыма сыграць. Людзі гэта беспамылкова адчувалі.

І менавіта яна сталася душой і сімвалам нават не перадвыбарчай кампаніі, а, так бы мовіць, агульначалавечай мары пра шчаслівую сям'ю, шчаслівае жыццё. Жыццё абароненае і трывалае, якое ніхто б не меў права і, галоўнае, не меў магчымасцяў ніякім чынам парушыць. Менавіта яе барацьба за вызваленне мужа, у абарону гонару і годнасці, супраць несправядлівасці і свавольства ўлады і надала барацьбе Аляксандра Казуліна высокі і светлы сэнс. І разам з тым такі зямны і просты, такі зразумелы кожнаму сэнс.

Яна дапамагла зразумець, што за ўлюбёным у аўтарытарных лідэраў лозунгам пра перавагу інтарэсаў народа і краіны над уласнымі, над інтарэсамі сваёй сям'і хаваецца выключна прага ўлады, сваёй — асабістай і неабмежаванай.

Ірына Іванаўна амаль не з'яўлялася на палітычных імпрэзах Аляксандра, пакуль яго прэзідэнцкая кампанія не набыла небяспечны для яго характар. З таго моманту — яна заўсёды побач. Насуперак волі мужа. Яна адлучылася толькі адзін раз, 25 сакавіка, калі Аляксандр Казулін рушыў на чале мірнай калоны дэманстрантаў да турмы на Акрэсціна. Меркавала — на паўгадзінкі, каб падрыхтаваць бутэрброды для яго і паплечнікаў, для перадачы (а раптам атрымаецца) зняволеным. Аказалася — на ўсё жыццё.

За выключэннем судовага працэсу і некалькіх спатканняў у калоніі. Працэс для яе быў невераградна цяжкім выпрабаваннем, дзе лінія сувязі — усяго толькі стрэчныя позіркі над судовым бар'ерам — з клеткі ў залу і наадварот. А вось спатканні ў калоніі — як глыток жыцця і кахання. Нават тады, калі Аляксандр трымаў, рызыкуючы жыццём, сваю беспрэцэдэнтную 53-дзённую галадоўку. А яна вяла сваю беспрэцэдэнтную барацьбу за яго вызваленне. Ахвяруючы сабой, не звяртаючы ўвагу на рак, які спакваля з'ядаў яе жыццё.

Бясконцая чарга сустрэч, паездак, выступленняў, інтэрв'ю. Без гучных фраз. Без ноткі істэрыкі, з вытрымкай і годнасцю. Метастазы пазбавілі Ірыну Іванаўну голасу. Яна гаварыла шэптам. І яе шэпт пачулі. Палітыкі і дыпламаты. Грамадскія дзеячы і вучоныя.

Ірына ратавала жыццё мужа, яе ўласнае ж згасала. Яна стойка і з гонарам вытрымала яшчэ адзін удар: абразлівы каментар кіраўніка дзяржавы з нагоды адмовы Аляксандра Казуліна прыняць вызваленне на капітулянцкіх пачатках. Але ці не забраў гэты ўдар апошнія сілы?.. Яна зусім крыху недачакалася выхаду мужа на волю.

Яна змагалася за выратаванне яго жыцця, за яго вызваленне. За гонар і годнасць — яго і свае. А атрымалася — за гонар і годнасць усіх людзей, за іх жыццё ў свабодзе. За гонар, годнасць і ўнутраную свабоду Беларусі.

Сваім жыццём і смерцю яна дапамагла людзям зразумець, што ёсць нешта, праз што нельга пераступаць. Яна прымусіла нават улады ўзгадаць пра міласэрнасць. І калі на яе пахаванне не адпускалі з калоніі Аляксандра Казуліна — сотні людзей выйшлі на плошчу з пратэстам. Улады вымушаны былі саступіць. А потым тысячы прыйшлі ў Чырвоны касцёл, каб развітацца з Ірынай Казулінай.

І вось прайшоў год без яе. Без яе фізічнай прысутнасці на зямлі. Але пры яе духоўным уплыве. Канешне, многае сцерлася, як бы знікла, развеялася на злых віхурах штодзённасці. Але ж вядома, што дабро ў чалавечым сусвеце прырастае зярняткамі ад учынкаў кожнага, таму і перамагае зло. Ад Ірыны Казулінай дадалося разуменне перавагі кахання над смерцю, міжчалавечай салідарнасці над варожасцю, каштоўнасці свабоды над каштоўнасцю «чаркі і шкваркі».

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ЛІДА

**Мастак Міхась Мельнікаў не пакваліўся на некалькі тысяч долараў і не прадаў у Польшчу ў прыватную калекцыю партрэт знакамітага земляка, кампазітара, славутага скрыпача, аўтара беларускай оперы «Маргер» на лібрэта Уладзіміра Сыракомлі, Канстанціна Антонія Гурскага, а перадаў яго Лідскаму гістарычна-мастацкаму музею.**

Антоні Гурскі — выбітная асоба. Ён быў дырыжорам аркестра Тыфліскай оперы, Харкаўскага сімфанічнага аркестра. Яго паважаў Пётр Чайкоўскі, і зараз на радзіме знакамітага рускага кампазітара ў горадзе Клін стаіць бюст Гурскаму.

У 1917 годзе Гурскі з'ехаў у Варшаву, дзе спачатку зарабляў грошы тапёрам у мясцовых кінатэатрах. Пасля перасяліўся ў Познань, дзе да канца сваіх дзён быў канцэртмайстарам Вялікага тэатра імя Манюшкі.

У Антонія Гурскага багатая творчая спадчына. Ім напісана больш за сто рамансаў, вакальныя творы, сімфанічныя паэмы, оперы, творы для скрыпкі і фартэп'яна. Музычная фантазія f-moll і зараз лічыцца адным з шэдэўраў польскай арганнай музыкі познага рамантызму.

Міхась Мельнікаў напісаў партрэт земляка з фотаздымка, які даслаў яму прыхільнік творчасці Гурскага.

Лідзяне памятаюць свайго земляка, і штогод у мясцовай музычнай вучэльні праходзяць мерапрыемствы з дня яго народзінаў.

### МАСТЫ



**Мастоўскія актывісты Руху «За Свабоду» ў межах грамадска-інфармацыйнай кампаніі «За Еўрапейскую Мастоўшчыну» распачалі акцыю супраць незаконнай дактыласкапіі мастоўскіх мужчын, якія на працягу апошніх дзён масава атрымліваюць позвы з'явіцца ў Мастоўскі РАУС для здачы адбіткаў пальцаў.**

У межах кампаніі плануецца шырокае інфармаванне насельніцтва Мастоўскага раёна з дапамогай матэрыялаў, якія распавядаюць пра добраахвотнасць гэтай працэдуры і магчымасць на законных падставах адмовіцца ад здачы адбіткаў пальцаў. Насельніцтва Мастоўшчыны будзе азнаёмлена з палажэннямі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай дактыласкапічнай рэгістрацыі» і палажэннямі Крымінальна-працэсуальнага Кодэкса Беларусі, якія тычацца рэгулявання дактыласкапічнай рэгістрацыі.

«Мы не выступаем супраць дактыласкапіі як законнага сродку выяўлення злачынцы або дактыласкапічнай рэгістрацыі згодна з артыкулам № 7 Закона Беларусі «Аб дзяржаўнай дактыласкапічнай рэгістрацыі», якая рэгламентуе правядзенне абавязковай дактыласкапіі ў адносінах да пэўнай катэгорыі грамадзян. Мы выступаем супраць незаконнай працэдуры зняцця адбіткаў пальцаў мастаўчан, якія маюць усе законныя падставы адмовіцца ад гэтай працэдуры. Гэта рабочыя Мастоўдрэва, прадпрымальнікі, супрацоўнікі ЖКГ і прадстаўнікі іншых цывільных прафесій. Сёння мы даслалі калектыўны зварот кіраўніку Мастоўскага РАУС Віктару Алесюку і пракурору Мастоўскага раёна з патрабаваннем патлумачыць незаконныя дзеянні мастоўскай міліцыі і прычыну масавага рассылання позваў для здачы адбіткаў пальцаў», — паведаміў рэгіянальны каардынатар Руху «За Свабоду» ў Гродзенскай вобласці Алесь Зарэмбюк.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

▸ ДЗЕНЬ ВОЛІ

## ПААСОБКУ І РАЗАМ

**Вольга ХВОІН**

**Упершыню за многія гады падрыхтоўка да Дня Волі адбываецца без удзелу аргкамітэта. Таму суб'екты Аб'яднаных дэмакратычных сілаў ды іншыя арганізацыі распрацоўваюць уласную канцэпцыю адзначэння 25 сакавіка. Пра гэта паведаміў журналістам старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька.**



Кіраўніцтва партыі БНФ яшчэ на пачатку лютага заявіла, што падае заяўку на правядзенне мітынгу і шэсця, стварае аргкамітэт, да працы якога будуць запрошаныя ўсе ахвочыя. Але пакуль ніякіх прапаноў да іншых суб'ектаў палітычнага поля не паступала. Анатоль Лябедзька расказаў, што прапануецца стратэгія, якая, на яго думку, дазволіць далучыць да акцыі многа людзей і арганізацый. Не робіцца акцэнт на арганізатараў, кожны рыхтуе свае інфармацыйныя матэрыялы, дзе найперш дэкларуецца час і месца збору: 25 сакавіка а 18-й гадзіне каля Акадэміі навук. На акцыю плануецца прыйсці з пакетам прапаноў кіраўніцтву Беларусі: антыкрызіснымі мерамі, зменамі ў заканадаўства.

Лідэр кампаніі «За свабоднае развіццё прадпрымальніцтва» Віктар Гарбачоў прытрымліваецца такой жа пазіцыі: «Хай кожны выйдзе са сваімі патрабаваннямі, але адзінай калонай. У нас ёсць праблемы, і мы будзем пра іх гаварыць 25, 26 сакавіка і надалей. Мы звяртаемся не толькі да прыхільнікаў нашай кампаніі, але і да іншых прадстаўнікоў прадпрымальніцкага руху далучыцца да нас на Дзень Волі».

Пра свой намер удзельнічаць у падрыхтоўцы святкавання Дня Волі заявілі старшыня грамадскага аб'яднання «Саюз Чарнобыль — Беларусь» Аляксандр Валчанін, юрыст і прадстаўнік руху афганцаў «Абаронцы Айчыны» Алег Волчак. Алег Волчак папярэдзіў пра магчымыя правакацыі, якія могуць быць арганізаваныя быццам бы ад імя афганцаў. «Апошнім часам спецслужбы актыўна апрацоўваюць афганскі рух, быццам бы мы збіраемся ўчыняць правакацыі, выбухі, падпалы. Але мы да гэтага ніякага дачынення не маем. Прад'яўлена абвінавачванне Аўтуховічу. Выявілася, што ў нас быццам бы былі цэлыя склады зброі, якую мы рыхтавалі да 25 сакавіка. Заяўляю, што ўсё гэта няпраўда. Мы — людзі мірныя», — падкрэсліў прадстаўнік руху афганцаў «Абаронцы Айчыны».

Анатоль Лябедзька лічыць, што толькі агульная, аб'яднаная пазіцыя дазволіць дагрукацца да ўладаў. «Калі акцыя будзе ўдалай, масавай, гэта азначае, што да «чырвонага дома» дойдуць асобныя пасланні. Улада не пачуе невялікую групу прадпрымальнікаў, чарнобыльцаў, партыі. Яна прыслухаецца толькі да тых, у кім адчувае сілу», — заявіў старшыня АГП.

▸ ЗАКЛІК

## ТАВАРЫСТВА АХОВЫ ПОМНІКАЎ ПРОСІЦЬ ДАПАМОГІ

**У заяве ад 17 лютага старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч заклікаў СМІ і грамадскасць падтрымаць грамадскае аб'яднанне.**

У заяве зазначаецца, што таварыства — адзіная спецыялізаваная арганізацыя ў Беларусі, якая паслядоўна і прынцыпова адстойвае правы на існаванне нацыянальных помнікаў гісторыі і культуры, выяўляе факты парушэння заканадаўства ў гэтай галіне з боку дзяржаўных органаў, выкрывае непасрэдна вінаватых у знішчэнні гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

«Незалежная грамадская ініцыятыва і аўтарытарная форма кіравання на ўсіх узроўнях беларускай дзяржавы — рэчы несумяшчальныя. І, як вынік, спробы на працягу гадоў аслабіць кволую грамадзянскую супольнасць, звесці ў нішто патэнцыял уплывовых грамадскіх аб'яднанняў праз прававы, эканамічны, інфармацыйны і іншы ўціск», — гаворыцца ў заяве.

Яе аўтар нагадвае, што ў 2004 годзе дзяржава незаконна нацыяналізавала будынак у Траецкім прадмесці сталіцы, адроджаны за сродкі аб'яднання, потым зрабіла былога інвестара арандатарам, а напрыканцы 2008 года канчаткова выселіла таварыства з гэтага будынка.

Паводле слоў Астаповіча, архіў таварыства, які змяшчае навуковую, прававую і фінансавую інфармацыю, часова перамешчаны ў памяшканне на гары былога будынка аб'яднання па вуліцы Старажоўская, 5. І зараз балансатрымальнік будынка КУП «Мінская спадчына» пад пагрозай вывазу архіва на сметнік патрабуе тэрмінова вызваліць гэтае неўладкаванае памяшканне, падкрэсліваецца ў заяве. Старшыня таварыства лічыць, што тэрміновасць патрабаванняў «Мінскай спадчыны» выклікана, у першую чаргу, дзейнасцю аб'яднання па выкрыцці і абнародаванні фактаў парушэнняў заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў Мінску і краіне.

▸ ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ЛЯВОНАЎ — У ШПІТАЛІ

**Адзін з актывістаў прадпрымальніцкага руху, затрыманы 8 лютага ў Ваўкавыску, Юрый Лявонаў пераведзены ў турэмную бальніцу на вуліцы Кальварыйскай у Мінску. Пра гэта БелаПАН паведаміла яго дачка Юлія.**

Паводле яе слоў, 16 лютага яна прыехала ў Мінск, каб перадаць бацьку перадачу. «У СІЗА мне сказалі, што ён пераведзены ў бальніцу ў нядзелю, 15 лютага», — сказала Ю. Лявонава. — «Я размаўляла са следчым. Ён паведаміў, што тату паклалі ў Рэспубліканскі турэмны шпіталь на Кальварыйскай вуліцы з дыягназам «камяні ў нырках». Такі дыягназ не вельмі праўдападобны. Сам следчы паехаў у Ваўкавыск, і яго ў Мінску няма. Таксама мне не ўдалося звязацца з адвакатам — ён быў недаступны па мабільным тэлефоне. Я прыйшла ў адвакацкую кантору, у якой ён працуе, і мне сказалі, што адвакат у камандзіроўцы».

Паводле слоў Юліі, да арышту ў яе бацькі праблем з ныркамі не ўзнікала.

Нагадаем, Мікалай Аўтуховіч, Юрый Лявонаў і Уладзімір Асіпенка былі затрыманы раніцай 8 лютага ў Ваўкавыску. Санкцыі на затрыманне і вобыск даў пракурор Гродзенскай вобласці.

▸ ЗАЯВА

## ВАЙСКОЎЦЫ СУПРАЦЬ ПРЫМУСУ

**Былыя вайскоўцы, а зараз вядомыя беларускія палітычныя і грамадскія дзеячы выступілі з адкрытай заявай у падтрымку Івана Шылы, Зміцера Федарука і Франака Вячоркі, якіх прымусова прызвалі на службу ў войска.**

Праваабаронца Алег Волчак, намеснік старшыні грамадскага аб'яднання «Рух «За свабоду» Аляксей Кавалец, юрыст Гары Паганяйла, старшыня «Саюза беларускіх пісьменнікаў» Алесь Пашкевіч і лідэр аргкамітэта па стварэнні «Народнай грамады» (Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі) Мікола Статкевіч выказваюць у заяве «рашучы пратэст супраць незаконных дзеянняў па прызыву на вайсковую службу моладзевых актывістаў».

«Тое, што адбылося, з'яўляецца супрацьпраўным актам, які дыскрэдытуе вайсковую службу і ідэю абароны Бацькаўшчыны як святы абавязак і права кожнага чалавека. Падобныя дзеянні адраджаюць практыку «палітычнай рэкрутчыны», якая практыкавалася царскім рэжымам для барацьбы з іншадумцамі», — гаворыцца ў заяве.

Праз супрацьпраўныя дзеянні шэрагу адказных асобаў беларускае войска ад інструменту абароны краіны ператвараецца ў інструмент палітычных рэпрэсій і падаўлення апазіцыі, зазначаюць падпісанты.

У звароце ўтрымліваецца заклік да ўсіх людзей, да медыкаў і вайскоўцаў, адказных за прызыўныя мерапрыемствы, «не заставацца бясслоўнымі заложнікамі палітычнай кан'юнктуры і праявіць цвёрдасць, не даць перапатварыць беларускае войска ў турму».

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# У САВЕЦЕ ЕЎРОПЫ ХОЧУЦЬ БАЧЫЦЬ БЕЛАРУСКУЮ АПАЗІЦЫЮ

Вольга ХВОІН

**Перамовы пра наданне Беларусі статуса адмыслова запрошанага ў Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы будуць весціся да чэрвеня, пасля чаго гэта пытанне будзе разгледжана і прынята адпаведнае рашэнне. Пра гэта паведаміў журналістам па выніках візіту ў Мінск дэлегацыі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы старшыня камісіі па палітычных пытаннях ПАРЕ спадар Горан Ліндблад.**



Горан Ліндблад

«Ізаляцыя ні да чаго добрага не прывяла, таму мы імкнёмся аднавіць статус Беларусі як адмыслова запрошанай у Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы. Да нас паступалі сігналы пра змяненні ў лепшы бок, — заявіў Горан Ліндблад. — Спачатку гэта пытанне абмяркуюць у камісіі па палітычных пытаннях, затым яно будзе вынесена на абмеркаванне ПАСЕ».

Прадстаўнік Савета Еўропы адзначыў, што не зусім верна будзе казаць пра тое, што Беларусь выканала ўсе ўмовы Еўрасаюза. Але некалькі разоў падкрэсліў, што асаблівых крытэраў для надання краіне статусу спецыяльнага госця не існуе. «Мы будзем настойваць на тым, каб былі прадстаўнікі апазіцыі. Важны дыялог, абмеркаванне працэсу. Я спадзяюся, што Беларусь стане сябрам Савета Еўропы і яе жыхары, напрыклад, змогуць свабодна звяртацца ў Страсбургскі суд, — пакрэсліў Горан Ліндблад. — Цяпер настаў паваротны момант, каб вярнуць Беларусь у сям'ю Еўропы, і фінансавы крызіс дапаможа нам у гэтым. У ЕС да Беларусі не толькі інтарэсы ў галіне свабодаў і правоў чалавека, суду, але і эканамічныя».

Прапанова стварыць сумесную афіцыйна-апазіцыйную дэлегацыю ў Савеце Еўропы была агучаная прадстаўнікамі ПАСЕ падчас сустрэч са спікерам Савета Рэспублікі Барысам Батурам і першым намеснікам Адміністрацыі прэзідэнта Наталляй Пяткевіч. Прадстаўнікі еўрапейскай дэлегацыі паведамілі, што з афіцыйнага боку былі пярэчанні наконт магчымага ўдзелу апазіцыі ў дэлегацыі.

Каб пацвердзіць неадэкватнасць пратэсту ўладаў, Горан Ліндблад прывёў прыклад Кітая, дзе няма апазіцыі ў парламенце. «Мы патрабуем, каб у дэлегацыю былі ўключаныя прадстаўнікі апазіцыі. Калі Беларусь стане сябрам Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы, то будуць толькі дзеючыя дэпутаты. Для спецыяльнага статусу ёсць спецыяльныя ўмовы», — заявіў кіраўнік палітычнай камісіі. — Цяпер робіцца ціск на тое, ці ідзе Беларусь па верным шляху. І паступаюць сігналы, што краіна на шляху дэмакратызацыі. Ёсць паўнавартасныя сябры Савета Еўропы, якія ідуць назад, а Беларусь рухаецца наперад».

Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька расказаў журналістам, што падчас сустрэчы прадстаўнікоў апазіцыі з дэлегацыяй ПАСЕ абмяркоўваўся варыянт шэсць плюс шэсць, калі ў беларускай дэлегацыі будуць прадстаўленыя шэсць чалавек ад парламента і шэсць чалавек ад апазіцыі.

Горан Ліндблад паведаміў, што за час візіту дэлегацыі абмяркоўваліся пытанні свабоды СМІ, рэгістрацыі і распаўсюду газет. Было закранута пытанне пра палітычныя знікненні, на што генеральны пракурор Беларусі паабацаў да чэрвеня падрыхтаваць мемарандум па апошніх выніках расследавання. Асноўнай мэтай візіту, па словах Ліндблада, было больш даведацца пра настрой у парламенце, партыях, НДА, грамадстве.

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ГОСЦІ, ГОСЦІ, ГОСЦІ, ХТОСЬЦІ ЁСЦЬ, НЯМА КАГОСЬЦІ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Такой колькасці замежных гасцей адначасова Беларусь, здаецца, не ведала. Беларусь наведвае шмат хто з еўрапейскіх структураў. Галоўнае, каб з гэтага быў плён. Але далёка не ўсе на такі дыялог ускладаюць вялікія надзеі.**

Напачатку тыдня ў Беларусь прыбыла дэлегацыя Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы. Дэлегацыю ўзначальвае старшыня Палітычнага камітэта асамблеі Горан Ліндблад. У яе складзе старшыня падкамітэта ПАСЕ па Беларусі Сініка Хурскайнен і дакладчык Парламенцкай асамблеі па сітуацыі ў Беларусі Андрэа Рыгоні.

Еўрапейскія палітыкі абмеркавалі з беларускімі ўладамі перспектывы далейшага дыялогу з Саветам Еўропы і ПАСЕ ў галіне дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства закона. У ходзе візіту адбыліся сустрэчы прадстаўнікоў еўраструктур са старшынямі абедзвюх палат Нацыянальнага сходу Беларусі, кіраўніцтва Адміністрацыі прэзідэнта, міністэрстваў замежных спраў, юстыцыі, інфармацыі і адукацыі, генеральным пракурорам, старшынямі Вярхоўнага і Канстытуцыйнага судоў.

Што тычыцца вынікаў гэтага візіту, то яны будуць, як заўсёды, вельмі дыпламатычныя. Але гэткая дыпламатыя зусім не даспадобы некаторым асобам. Найперш, гэта звязана з пазіцыяй Еўропы ў дачыненні да Беларусі.

Еўрасаюз павінен вызначыцца, што для яго мае большую значнасць: каштоўнасці дэмакратыі і маралі або дыялог з Лукашэнкам. Такое меркаванне выказаў 16 лютага на прэс-канферэнцыі ў Мінску лідэр міжнароднай маладзёжнай арганізацыі «Малады фронт» (Чэхія) Зміцер Дашкевіч.

Паводле яго слоў, «Малады фронт» з самога пачатку ставіўся крытычна да дыялогу беларускай улады з Захадам. «Паводле нашага меркавання, дыялог не можа праходзіць у такім фармаце, у якім ён праходзіць. Аляксандрам Лукашэнкам не зроблена ніякіх пэўных крокаў да паляпшэння сітуацыі ў Беларусі. У той жа час, мы не жадалі займацца толькі тым, як крытыкаваць распачаты працэс. Але найперш мы імкнуліся выставіць свае ўмовы фармату дыялогу. Патрабаванні былі вельмі простыя: адмена антыканстытуцыйнага артыкула 193-1 Крымінальнага кодэкса Беларусі (дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі), рэгістрацыя ўсіх грамадскіх аб'яднанняў, якія на гэта прэтэндуюць, вызваленне і поўная амністыя палітвязняў, свабода слова і свабода сходаў грамадзян», — заявіў Дашкевіч.

«Паводле нашага меркавання, у Еўропы павінна быць пэўная пазіцыя. Лідэры еўрапейскіх краін павінны вызначыцца, што для іх важнейшае: каштоўнасці дэмакратыі і маралі або дыялог з Лукашэнкам. Рабіць адно і другое немагчыма ў сённяшніх беларускіх умовах. Калі стаіць задача любой цаной весці дыялог з Лукашэнкам — калі ласка, вядзіце, гэта ваша пазіцыя і ваша меркаванне. Калі задача змагацца за каштоўнасці дэмакратыі і свабоды, дык трэба карэктаваць сваю пазіцыю», — лічыць лідэр «Маладога фронту».

Зміцер Дашкевіч не адзінокі ў сваім скепсісе. Таксама нейкі скепсіс з нагоды візіту дэлегацыі выказаў і не хто іншы, як Аляксандр Лукашэнка. «Апазіцыя ад нас выбіваць нічога не будзе праз Еўрасаюз і Амерыку», — заявіў Аляксандр Лукашэнка 17 лютага падчас візіту на магілёўскае ААТ «Бабулін гладыш».

«Яны сачынілі цэлую цялегу, апазіцыянеры, — у мяне гэта сачыненне, на стале гэты дакумент ляжыць. Вось гэта трэба патрабаваць ад «Лукашэнкі і яго ўлады, каб яны» зрабілі, — сказаў А. Лукашэнка. — І чэшскае старшынства сёння пачынае фарміраваць парадак дня з Беларуссю зыходзячы з патрабаванняў гэтак званай «апазіцыі», якую нават вы не бачыце праз вялікае павелічальнае шкло. Я папярэдзіў міністра замежных спраў і сёння ўпершыню публічна кажу: такі падыход да перамоў з Беларуссю неперспектыўны. У нас ёсць сфарміраваны парадак дня, вельмі важныя пытанні, а не тое, што патрабуе апазіцыя».

Адказваючы на пытанне пра арышт ваўкавыскіх прадпрымальнікаў, беларускі кіраўнік заявіў: «Яны ўжо ў апазіцыю пайшлі. У нас як толькі недзе кагосьці прыдушылі за справу, тыповы злачынца — ён тады апазіцыянер. Але гэта ўжо вядома, і, напэўна, у Еўропе гэта зразумелі. Там, на мой погляд, штосьці са зброяй было звязана. ...У нас закон адзін. Мы ўжо наеліся 3 ліпеня. Няхай гэта там воплеск быў нейкі, людзі пацярпелі, але гэтага ў краіне быць не павінна. …Аўтаматы законна прыватніку захоўваць нельга. І іншыя гранаты там, выбуховыя прыстасаванні. Самы жорсткі будзе запыт. Тэрору ў краіне дапусціць я не магу».

Канешне, дзіўна, што прэзідэнт называе самы гучны тэракт у Мінску «воплескам». Пра аўтаматы і гранаты, якія прыватнай асобе захоўваць нельга, — гэта зразумела. Але ж тут трэба было б звярнуць увагу на тое, што гэты выбух дагэтуль не расследаваны, віноватыя ў здзяйсненні яго не схопленыя і не пакараныя. І тут узнікае пытанне: дзе ж той «самы жорсткі будзе запыт»?

Скептычна паставіўся да візіту дэлегацыі ПАСЕ і лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька. «Прадстаўнікі дэмакратычных сіл таксама не маюць канчатковай пазіцыі па прадастаўленні Беларусі статусу спецыяльнага запрошанага ў ПАСЕ, — сказаў старшыня АГП. — Для нас гэта пытанне не першаснае. Больш важныя ўмовы, якія неабходна выканаць уладам для паўнапраўнага ўдзелу ў ПАСЕ». Лідэр АГП нагадаў дэлегацыі ПАСЕ акалічнасці аднаўлення для Нацыянальнага сходу статусу спецыяльнага запрошанага ў АБСЕ. «У 2000 годзе прадстаўнікі ўладаў казалі пра маладую дэмакратыю, пра неабходнасць інтэграцыі з Еўропай — пра тое, што і цяпер. Аднак за дзевяць гадоў на шляху да дэмакратыі Беларусь практычна не прасунулася. Еўрапейскім структурам не варта наступаць на тыя ж граблі», — зазначыў палітык.

Карацей, візіт ПАСЕ большасць з палітыкаў расчараваў. Але што далей?

Позна вечарам 18 лютага ў Мінск з афіцыйным візітам прыбыў вярхоўны прадстаўнік Еўрасаюза па знешняй палітыцы і бяспецы Хаўер Салана. Гэта першы візіт еўрачыноўніка такога ўзроўню ў Беларусь. Ці будзе гэты візіт настолькі ж «выніковым», як і візіт дэлегацыі ПАСЕ? Пабачым на будучым тыдні.

ПАЛЕМІКА

### Ад рэдакцыі

**Імя Вячаслава Оргіша добра вядомае ў дэмакратычным асяродку. Доктар філасофіі, ён доўгі час працаваў у «Народнай волі». Яго артыкулы вызначаліся выразнай апазіцыйнасцю. Але вось нядаўна ён перайшоў працаваць у «СБ» Беларусь сегодня» — галоўную газету ўладаў. Такія рэзкія пераходы заўсёды выклікаюць пытанні. Сам В. Оргіш, як можна зразумець з яго артыкула пад красамоўнай назвай «Прыйшоў час сыходзіць з барыкад», сваё рашэнне тлумачыць прынцыповымі матывамі. Не па факту пераходу, а па зместу артыкула, з ім палемізуе вядомы палітык, прафесар Юры Хадыка. Свой артыкул Юры Віктаравіч даслаў у «СБ», аднак газеце яго не надрукавалі, а размясцілі на сайце. З-за парушэння роўнасці ўмоў для палемікі, а таксама з улікам таго, што дэмакратычны асяродак «СБ» (тым больш сайт) з-за адназначна зададзенай пазіцыі выдання не чытае, Юры Хадыка звярнуўся да нас з просьбай надрукаваць яго артыкул. Мы з задавальненнем гэта робім, тым больш што праблемы, якія ён узняў, на жаль, не страцілі сваёй актуальнасці.**

# З ЛЮБОЎЮ І НАДЗЕЯЙ

Юры ХАДЫКА

**Калі я чытаў вялізны артыкул доктара філасофскіх навук, прафесара В. Оргіша «Прыйшоў час сыходзіць з барыкад», які быў змешчаны ў нумарах 238 і 239 «СБ» за 2008 год, я зрабіў больш за 50 паметак, якія выклікалі пярэчанні. І зразумеў, што адказаць на кожную з іх немагчыма. Тады я стаў іх сістэматызаваць і высвятліў, што тэмаў для абмеркавання менш. Таму палеміка можа мець цывілізаваны характар.**


Фота Ю. Дзядзінкіна

### Апалогія апазіцыі

Не шанцуе беларускай апазіцыі. Яна падвяргаецца крытыцы не толькі ў прамовах прэзідэнта, але і ў публікацыях многіх палітолагаў. Яскравы прыклад — В. Оргіш. Я толькі пералічу, у чым ён абвінавачвае прыхільнікаў апазіцыі. Захад не бачыць магчымасці, каб беларуская апазіцыя істотна ўплывала на палітычны працэс у краіне, страчвае да яе цікавасць і таму адводзіць ёй ролю «другога плана». Апазіцыя не хоча дыялога з уладай і глядзіць «непрымірыча» на палітычнага праціўніка. Яе вярхушка нічому не вучыцца, і ёй уласцівы інфантылізм мыслення. Апазіцыйны аўтарытэт А. Саннікаў, апазіцыйны ветэран У. Мілінкевіч і гуру ПБНФ Ю. Хадыка — тыповыя палітычныя фундаменталісты. У апазіцыі няма інстытуцыянальнага каркасу. Іншымі словамі, інтэлектуальных магчымасцей узначаліць дзяржаўныя органы. Апазіцыя ўспрымае намер Брусэлю, які схільны да дыялогу з існуючым рэжымам, як памылку, таму што ёй уласціва «барыкадная культура». Апазіцыя прайграла ўсё, што можна прайграць, таму што яе амбіцыі не адпавядаюць амуніцыі.

В. Оргіш называе існуючыя Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы (АДС) тытульнай апазіцыяй і прадказвае ёй хуткі заняпад, калі яна не стане сістэмнай апазіцыяй. Іншымі словамі, калі яе прадстаўнікі не ўвойдуць у структуры ўлады. Я не згодны і з гэтым. АДС — сістэмная апазіцыя і займае тое месца, якое для апазіцыі адводзіць існуючы палітычны рэжым. А ён не прадугледжвае магчымасці прысутнасці апазіцыі ў структурах улады. Калі ж такая магчымасць існавала, у складзе ВС і XII і XIII скліканняў былі ўплывовыя і канструктыўныя апазіцыйныя фракцыі. Таму няма розніцы паміж тытульнай і сістэмнай апазіцыяй у нашых умовах. Праблема ў існуючай выбарчай сістэме. В. Оргіш не верыць, што яна можа памяняцца. А я — веру.

Я ў тытульнай — а таму адказнай — апазіцыі з моманту яе арганізацыйнага паўстання. Выступаючы на першым дазволеным уладамі мітынгу ў студзені 1989 года на стадыёне «Дынама» ў прысутнасці прыкладна 30 тысяч чалавек, я параўнаў тагачасных прыхільнікаў дэмакратыі з лёгкай кавалерыяй Вялікага князя Вітаўта, якая распачала атаку на гуфы нямецкага рыцарскага войска пад Грунвальдам праз воўчыя ямы. І не дайшла да ворага, пакуль не запоўніліся ямы целамі коней і вершнікаў. Сапраўды, мы кінулі выклік сістэме, якая здавалася непарушнай. Разлічваць на хуткую перамогу было немагчыма.

А што мы бачым сёння? Перадвыбарчы лозунг БНФ «Адраджэнне» 1990 года «За Беларусь!» з 2004-га стаў афіцыйным лозунгам дзяржавы. Пэўны час — з моманту славутых «Детей лжи» і да пуцінскіх «мух и котлет» — мы былі «барыкаднай» апазіцыяй. Бо рэферэндум 1995 года зняважыў беларускія нацыянальныя сімвалы і да 2003 года існавала рэальная небяспека суверэнітэту краіны. А дзе сёння І. Ціцянкоў, які публічна здзекаваўся з бел-чырвона-белага сцягу? А слухаючы сёння прамовы прэзідэнта пра незалежнасць, я ў захапленні, бо няма нічога дадаць да яго выказванняў. Акрамя таго, што сапраўды незалежнай можа быць толькі краіна свабодных людзей. Так, у апошнім інтэрв'ю А. Лукашэнка паабяцаў шчыльна заняцца праблемай правоў чалавека ў Беларусі. Даўно час.

Цяжка пералічыць, колькі праектаў рэфармавання беларускай гаспадаркі распрацавала апазіцыя. Яны выкладзены ў брашурах, кнігах і артыкулах вядомых эканамістаў Л. Злотнікава і Л. Заікі, М. Залескага і В. Шлындзікава, Я. Раманчука і І. Нікітчанкі, С. Багданкевіча і Б. Жалібы. Ды і многіх іншых.

Гэта да інтэлектуальнага і кадравага патэнцыялу беларускай апазіцыі.

### Пра галоўнае

Але я адышоў ад галоўнага абвінавачвання ў няздольнасці апазіцыі да дыялогу з урадам і ў неразуменні Брусэля, які такі дыялог распачынае. Дзіўна, але, здаецца, В. Оргіш не ведае, што Брусель распачаў такі дыялог яшчэ ў 1997 годзе, калі ўвесну ў Мінск прыляцеў пасол Марэна, каб улагодзіць адносіны ўрада і апазіцыі, якую прадстаўлялі Г. Карпенка і П. Краўчанка. Хто быў з урадавага боку, не ведаю. Аднак ініцыятыва ЕС праваліласся, і ў верасні Брусель прыняў першыя санкцыі ў адносінах Мінска. Без усялякай ініцыятывы з боку апазіцыі.

Але гісторыя дыялогу на гэтым не скончылася. У хуткім часе Б. Герэмек дамогся адкрыцця ў Мінску прадстаўніцтва АБСЕ, якое ўзначаліў Ханс-Георг Вік. Два гады ён арганізоўваў дыялог улады і апазіцыі. І амаль арганізаваў. Была складзена папера пра доступ апазіцыі да дзяржаўных СМІ. Папера, падпісаная прадстаўніком прэзідэнта Сазонавым. Аднак яна хутка была адкінута, бо А. Лукашэнка падтрымаў ідэю «шырокага дыялога», за якую агітавалі В. Абрамава, Т. Процька, Ю. Загуменаў, А. Фядута. Нетытульная апазіцыя, як сказаў бы В. Оргіш. Пад гэтай назвай хаваўся не дыялог, а права звярнуцца да вышэйшай інстанцыі са сваімі скаргамі і прапановамі. Зразумела, што тытульная апазіцыя адкінула гэткі фармат. І сёння нават В. Оргіш не памятае, што такі дыялог, за які ён агітуе, і з такой апазіцыяй, якая яму падабаецца, меў месца. Але не меў вынікаў. Калі не лічыць два парламенцкія тэрміны сп. Абрамавай.

Таму сто разоў мае рацыю А. Саннікаў, калі падкрэслівае, што вострай праблемай у Беларусі ёсць не дыялог з ЕС — ён ідзе і будзе ісці, — а ўнутрыбеларускі дыялог улады з тытульнай (сістэмнай) апазіцыяй. Такі дыялог і далей будзе заставацца мэтаю дэмакратычнага Захаду, які так лёгка, як лічыць В. Оргіш, не забывае пра свае ідэалагічныя каштоўнасці і правы чалавека.

### Конь Калігулы

І тут я падыходжу да галоўнага абвінавачвання на свой адрас. В. Оргіш цытуе адно маё выказванне, што прагучала на «Радыё Свабода» 27 чэрвеня 2008 года. «Гэта факт: рэжым усталяваўся, у яго шмат прыхільнікаў. І такую структуру значна лягчэй разбурыць, калі ўнутры яе будуць знаходзіцца прыхільнікі суверэнітэту, прыхільнікі прававой краіны, прыхільнікі правоў чалавека». Дзіўна, што гэта выказванне стала «дакладным тлумачэннем таго, чаму ні адзін кандыдат ад апазіцыі на вераснёўскіх выбарах не трапіў у парламент». Не думаю, што кандыдаты ад апазіцыі цыталі маё выказванне ў сваіх улётках. Ці ўвесь народ слухаў 27 чэрвеня перадачы «Радыё Свабода». Яшчэ больш дзіўна, што гэтае выказванне можна лічыць «траянскім канём» апазіцыі. Заўсёды лічыў, што выраз «траянскі конь» — эўфемізм словаў «хлусня», «падман». Мая ж фраза — адкрытая дэкларацыя мэты, змагання з узнятым забралам. Сэнс, працілеглы «траянскаму каню».

Аднак з разгорнутых разважанняў В. Оргіша вынікае, што яго абурылі словы «разбурыць такую структуру». Ён прыхільнік эвалюцыі. Аднак сусветны вопыт сведчыць, што ні адзін аўтарытарны, дыктатарскі ці тыранічны рэжым не эвалюцыянаваў у дэмакратычны без злому прававой структуры сістэмы. Партугалія, Іспанія, Італія, Германія, Грэцыя, усходнееўрапейскія краіны т. зв. сацыялістычнага лагеру, рэспублікі Прыбалтыкі таму прыклад. Толькі ў некаторых выпадках разбурэнне прававых падвалін рэжыму суправаджалася сацыяльнымі забурэннямі. Пра іх магчымасць трэба ведаць і пазбягаць іх. Менавіта ў гэтым сэнс маёй фразы.

Шлях Беларусі да дэмакратыі пачаўся ў канцы 80-х гадоў. Але хутка змяніўся на адваротны. Мы не здолелі ні пераканаць, ні ізаляваць большасць камуністычнай наменклатуры. І прэзідэнт Лукашэнка, прыйшоўшы да ўлады, пабудаваў сваю «вертыкаль» з ужо гатовага матэрыялу. Але ж гэтая «ўплывовая сіла» — не клас, як піша В. Оргіш, а клан, аб'яднаны толькі прагаю да ўлады. Ён і стварыў прававую базу дзейнага рэжыму, якая разлічана на недапушчэнне канкурэнцыі за ўладу.

Толькі сумленныя, свабодныя выбары могуць мірна вырашыць гэту ключавую праблему Беларусі. Можна не сумнявацца, што дэмакратычны свет і беларуская апазіцыя будуць разам змагацца за такія выбары.



Фота Ю. Дзядзінкіна

**Акцыя салідарнасці 16 лютага. Другая злева Людміла Асіпенка, дачка зняволенага Уладзіміра Асіпенкі.**

Адсутнасць канкурэнцыі заўсёды вядзе да застою і загнівання ў кіруючых колах, што выражаецца ў хабарніцтве, хлуслівых справаздачах і паказным адзінадушшы. З цягам часу дэмакратычныя па форме інстытуты выраджаюцца ў дэкаратыўныя бяздзейсныя структуры, якія адыгрываюць ролю фігавых лісткоў рэжыму. Калісьці адзін з першых рымскіх імператараў Калігула (Сапажок), які карыстаўся тытулам першага сенатара, гаварыў, што можа зрабіць сенатарам свайго каня. Баюся, што калі б А. Лукашэнка меў свайго скакуна, то мог бы сказаць тое ж самае. Цалкам на законнай аснове.

## Піянеры супраць камуністаў

У адным магу пагадзіцца з паважаным крытыкам. Апазіцыі не хапае адзінства. А дэмакратычны рух пачынаўся так добра. Як саюз прыхільнікаў дэмакратыі з лепшымі сіламі КПСС. І мне дзіўна і смешна сёння, калі даўно няма КПСС, чуць антыкамуністычныя філіпікі з вуснаў маладзёнаў ва ўзросце каля 30. Сённяшнія камуністы не нясуць калектыўнай адказнасці за справы таго часу. Ды і калектыўную адказнасць не прызнае ні закон, ні хрысціянская мараль. Толькі персанальную адказнасць прызнае наша культура.

Як я памятую, сп. Оргіш прысутнічаў на апошнім Кангрэсе дэмакратычных сіл. Ён павінны памятаць, які гвалт узнялі некаторыя маладыя нетытульныя апазіцыянеры пры абмеркаванні новай стратэгіі АДС. Менавіта вакол тэзіса пра дыялог з уладаю і праблемы існавання АДС з удзелам ПКБ. Яшчэ больш сорамна за тых сталых апазіцыянераў, былых камуністаў, якія гэты гвалт падтрымалі. Я магу прапанаваць толькі адно тлумачэнне гэткай дзіўнай сітуацыі.

Вядома, што яшчэ царская ахранка вынайшла самы эфектыўны сродак змагання з радыкальнай апазіцыяй, якая кідала бомбы. Гэты сродак — правакацыя. Славуты Азеф, кіраўнік баявога крыла партыі эсэраў і член Дзярждумы, таму яскравы прыклад. Думаць, што АДС дзейнічае ў стэрыльных умовах, наіўна.

Як існаванне Бога высвятляецца шляхам назірання за яго справамі, так і прысутнасць малых азефаў адчуваецца па некаторых крызісах у межах ці за межамі АДС.

## Хлуслівыя лічбы

Я неаднаразова крытыкаваў адзіны незалежны сацыялагічны цэнтр, які працуе ў Беларусі. Не за тое, што спецыялісты НІСЭПД няправільна праводзяць апытанні ці падлічваюць пададзеныя галасы. Толькі за тое, што не могуць пры падвядзенні і абмеркаванні вынікаў улічыць эфект страху, які абавязкова прысутнічае ў несвабодным грамадстве. Гэты эфект найбольш праяўляецца пры высвятленні палітычных поглядаў. Што цалкам натуральна. Так, сацыёлагі цягам многіх гадоў сцвярджаюць, што падтрымка дэмакратычных партый у грамадстве падае і замерла на мяжы статыстычнай памылкі. Улічыў гэта ў сваім выкрыцці тытульнай апазіцыі і прафесар Оргіш. Ён прывёў табліцу дынамікі індэксу даверу апазіцыйным партыям і тэхніку падліку гэтага індэксу. Пры першым поглядзе бачна, што індэкс адмоўны і ніжэй за 0,5. Здаецца, горш не бывае. Але дастаткова рашыць элементарнае алгебраічнае ўраўненне з адным невядомым (што лёгка зрабіць нават без асадкі — трэба скласці з адзінкай індэкс і атрыманую лічбу падзяліць напалам, каб атрымаць долю тых, хто давярае) і вы пабачыце, што працэнт давяраючых апазіцыі з лістапада 2000-га да кастрычніка 2008 года вагаўся ў межах ад 24% да 33% без якой-небудзь тэндэнцыі да падзення!

Гэтая ацэнка добра карэлюе з лічбамі, якія апазіцыйныя кандыдаты атрымлівалі падчас прэзідэнцкіх выбараў з 1994 да 2006 года. Таму неяк не верыцца, што сума падтрымкі партый АДС каля 10%. Іншая справа, рэйтынгі былых кандыдатаў. Адразу па выбарах яны ляжаць у межах 30%. Але пасля сыходу чалавека з інфармацыйнай прасторы паступова падаюць. Так што дарма В. Оргіш прадказвае занепад апазіцыі. Калі будзе рэфармавана выбарчае заканадаўства і на выбарчых участках не будзе панаваць яго вялікасць адміністратыўны рэсурс, АДС атрымае каля трэці месцаў у парламенце пры прапарцыйнай сістэме галасавання.

Так што прэтэнзіі АДС на раўнапраўны дыялог з уладаю апраўданыя. Іх амбіцыі адпавядаюць амуніцыі.

## Тое, што новае…

Застаецца спыніцца толькі на станоўчай праграме для апазіцыі, накіданай доктарам філасофскіх навук. Яна налічвае 7 тэзісаў. Большасць з іх не новая. І гэта сведчыць пра супадзенне поглядаў на тактыку АДС. Апазіцыя дэ-факта прызнала легітымнасць прэзідэнта яшчэ ў 2001 годзе, калі прыняла ўдзел у прэзідэнцкіх выбарах. Слушна і тое, што галоўнае змаганне ідзе з «палітычным класам», які сфармаваўся вакол А. Лукашэнкі. Сапраўдную вагу статыстыкі, якую прыводзіць В. Оргіш, я паказаў вышэй. Прапанова шукаць кансенсус з кіруючай элітай слушная. А вось папярэджанне баяцца прыўладнай партыі, створанай на грунце РГА «Белая Русь» — тыповая прафесарская фантазія. Такія структуры, як Адзіная Расія, не могуць эвалюцыянаваць у дэмакратычныя партыі. Сумненні В. Оргіша адносна здольнасці апазіцыі ўлічваць новыя палітычныя рэаліі пакіну без каментару.

Мне здаецца, што я крыху асвятліў занадта змрочны палітычны пейзаж, намаляваны прафесарам В. Оргішам. Бо мы жывём у адной краіне, якую любім, і ўсе хочам, каб нашым дзецям і ўнукам было ў ёй добра.

ДЫЯЛОГ

# ЛІБЕРАЛЬНА БЕРЦАМІ ПА НЫРКАХ

Вольга ХВОІН

**З пачатку года па Беларусі пракацілася хваля «лібералізацыі». На Дзень любові 14 лютага яна ўвасобілася ў брутальным разгоне мірнай акцыі. Калі ацэньваць выказванні кіраўніцтва краіны, гэта — не выпадковасць.**

Словы «лібералізацыя» і «дыялог» апошнім часам гучаць ледзь не з кожнага слупа, прыжываюцца нават у гаспадароў высокіх кабінетаў. Масавыя запрашэнні прадстаўнікам апазіцыі ў каардынацыйныя рады далі надзею, што іх хочуць пачуць. Некаторыя пабачылі ў «лібералізацыі» магчымасці для новага вітку развіцця — усё ж шматгадовае змаганне з рэжымам стамляе нават самых апантаных. А тут такое!

Паказальна арыштоўваюць з недарэчнымі абвінавачваннямі ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава, Уладзіміра Асіпенку. Праз тыдзень арыштоўваюць на ўкраінска-беларускай мяжы актывіста «Маладога Фронта» Арцёма Дубскага, які з'ехаў на Украіну, калі даведаўся, што на яго завялі крымінальную справу па арт. 415 Крымінальнага кодэкса за парушэнне парадку адбыцця пакарання, да якога яго прысудзілі за ўдзел у акцыі пратэсту прадпрымальнікаў зімою 2008 года. Арцём Дубскі быў асуджаны на 2 гады абмежавання волі без адбыцця тэрміна ў спецыяльных установах. Гаворыць, што Арцём не першы раз прыязджаў у Беларусь да сваякоў.

У дзень традыцыйнай штогадовай акцыі любові 14 лютага, якую «Малады Фронт» ладзіў у дванаццаты раз, на кватэрах актывістаў моладзевай арганізацыі адбыліся вобшукі. Без тлумачэнняў і прад'яўлення санкцыі пракурора супрацоўнікі міліцыі канфіскавалі дакументы, датычныя дзейнасці арганізацыі, а таксама прыватныя рэчы (ноўтбукі, фотаапараты) актывістаў Мікалая Дземідзенкі, Валерыя Мацкевіча, Кацярыны Галіцкай і Вадзіма Ханякі. Ці вернуць гэта гаспадарам — не вядома. Вечарам таго ж дня супрацоўнікі міліцыі і байцы спецназу брутальна разагналі мірную акцыю ў цэнтры горада. «Малады Фронт» падаваў заяўку ў Мінгарвыканкам з просьбай дазволіць правесці акцыю на плошчы Якуба Коласа ў Мінску.

Натуральна, арганізатары атрымалі адмову, але ад сваіх планаў вырашылі не адыходзіць. Вечарам у цэнтры горада сабралася каля ста чалавек, некаторыя прыйшлі са сваімі дзецьмі — акцыя ж «любові». Але тэатралізаванае свята хуткаператварылася ў пабоішча. Не зважаючы на тое, што ў натоўпе былі дзеці, дзяўчаты, міліцыя і АМАП з прымяненнем сілы людзей разагналі. Былі збітыя лідэр «Маладога фронту» Зміцер Дашкевіч, актывісты арганізацыі Мікалай Дземідзенка і Павал Кур'яновіч. Зміцер Дашкевіч ацаніў вынікі акцыі як сапраўдную праяву волі ўладаў, падкрэсліўшы, што лібералізацыя ёсць толькі на словах, а ў дзеянні гэта — хлусня і фарс.

Сцэнар разгону, хіба што ў менш брутальнай форме, паўтарыўся на Дзень салідарнасці 16 лютага. Каля 70 чалавек у знак падтрымкі выйшлі на Кастрычніцкую плошчу ў цэнтры сталіцы з партрэтамі маладафронтаўца Арцёма Дубскага, прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава, Уладзіміра Асіпенкі. Сярод удзельнікаў акцыі салідарнасці былі палітыкі Анатоль Лябедзька, Аляксандр Казулін,



Фота Ю. Дзядзінкіна

Андрэй Саннікаў. Хвілін праз пятнаццаць АМАП выціснуў людзей з цэнтральнай вуліцы. Былі збітыя Уладзь Сяргееў і Зміцер Бародка.

Вулічныя акцыі апошніх дзён наўрад ці пагражалі чым-небудзь уладам. Маладафронтаўцы ў касцюмах анёлаў і людзі з партрэтамі зняволеных не збіраліся браць штурмам адміністрацыйныя будынкі, дык навошта было пускаць у ход гумавыя дручкі, кулакі і берцы? Для чаго ўвогуле ўладам спатрэбілася арганізаваць новыя паказальныя арышты: дэманстрацыя сілы Захаду, які ставіць умовы беларускаму рэжыму палепшыць сітуацыю з правамі чалавека? Ці пробныя каменьчыкі: што важней еўрапейскім палітыкам — эканамічныя інтарэсы ці дзесятак збітых апазіцыянераў?

Прыхільнік эвалюцыйнага развіцця дзяржаўнага строю Беларусі Аляксандр Мілінкевіч падчас канферэнцыі руху «За Свабоду» заявіў, што разглядае новыя крокі ў знешняй палітыцы «не як дыялог асобаў, а як дыялог Еўрасаюза і Беларусі». «Трэба глядзець, што выгадна нашай краіне, яе народу, што спрыяе дабрабыту людзей, умацоўвае незалежнасць. Калі мы любім сваю Бацькаўшчыну, мы абавязаныя думаць пра будучыню нашых дзяцей сёння, нават ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму, — лічыць палітык. — Эгаістычна разглядаць тое, што адбываецца зараз у Беларусі толькі з пункту гледжання барацьбы апазіцыі з Лукашэнкам. Бесперспектыўна для нас заняць пазіцыю выключна старонніх ацэншчыкаў працэсу дыялога. Сённяшняя ўнутраная палітыка — гэта не толькі бокс, а ўсё больш — шахматы. Гуляць трэба не эмоцыямі, а розумам».

Дарэмна Аляксандр Мілінкевіч не прыйшоў на акцыю салідарнасць 16 лютага ці Дзень любові 14-га: на свае вочы мог бы ўпэўніцца, што ўлады пакуль прапануюць толькі «бокс». Лідэр руху «За свабоду» нагадвае, што ўлада мусіць спыніць палітычна матываваныя пераследы. «Трэба рэалізаваць «нулявы варыянт»: рэальная дэмакратызацыя пачынаецца з поўнай адсутнасці рэпрэсій і ўціску супраць іншадумцаў. Упэўнены, што Еўрасаюз падзяляе такую пазіцыю». Так і хочацца ўсклікнуць: залатыя словы! Праўда, праблема ў тым, што яны застаюцца толькі словамі. І ЕС з гэтым маўкліва пагаджаецца.

Каб прыхільнікі дыялогу не песцілі залішніх ілюзій, кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас візіту ў Магілёў расказаў журналістам, якую ролю ў перамовах з Захадам ён адводзіць апазіцыі, якую «і праз павеліччальнае шкло не ўбачыць».

Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў, што ёсць план перамоў паміж Мінскам і Бруселем, які ўтрымлівае важныя пытанні, «а не тое, што патрабуе апазіцыя». Каб канчаткова паказаць сваім апанентам на іх месца, Лукашэнка зрабіў недвухсэнсоўны намёк на справу ваўкавыскіх прадпрымальнікаў: «У нас, як толькі кагосьці прыдушылі за злачынныя справы — ён адразу ж становіцца «апазіцыянерам». Натуральна, ствараючы такі імідж для апазіцыі, Лукашэнка забяспечвае сабе апраўданне ў вачах беларусаў, якія больш за эканамічны крызіс баяцца толькі вайны. Але куды больш непрыемна і небяспечна будзе, калі ў гэта захоча паверыць Еўропа, не пакінуўшы супрацьвагі гумавым дручкам і берцам АМАПу.

З 16 лютага ў Беларусі знаходзіцца місія дэлегацыі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы пад кіраўніцтвам старшыні Палітычнага камітэта асамблеі Гарана Ліндблада. У яе складзе — старшыня падкамітэта ПАСЕ па Беларусі Сініка Хурскайнен і дакладчык Парламенцкай асамблеі па сітуацыі ў Беларусі Андрэа Рыгоні. 18 лютага ў Мінск з афіцыйным візітам прыбыў вярхоўны прадстаўнік Еўрасаюза па знешняй палітыцы і бяспецы Хаўер Салана. Ён мае сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам, кіраўніком МЗС Беларусі Сяргеем Мартынавым, лідэрамі апазіцыйных партый, у тым ліку і з Мілінкевічам, прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці, са старшынёй БАЖ Жаннай Літвіной. Гэта першы візіт еўрачыноўніка такога ўзроўню ў Беларусь.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# РАСІЯНЕ ВЫДАЮЦЬ БЕЛАРУСКУЮ ПІСЬМЕННІЦУ

Генадзь КЕСНЕР

**Падчас Мінскага Міжнароднага кніжнага кірмашу адбылася прэзентацыя першых чатырох тамоў поўнага збору твораў вядомай беларускай пісьменніцы Святланы Алексіевіч, якая з'яўляецца, бадай, самай выдаваемай беларускай літаратаркай у свеце.**

На сустрэчу з пісьменніцай у імправізаваную канферэнц-залу маскоўскага выдавецтва «Время», якое займаецца выданнем твораў Васіля Быкава і Святланы Алексіевіч, прыйшло столькі людзей, што месца хапіла далёка не ўсім жадаючым папрысутнічаць на імпрэзе.

Зараз Святлана Аляксандраўна стала жыве ў нямецкай сталіцы. Аўтарка такіх вядомых у свеце твораў, як «Чарнобыльская малітва», «У вайны не жаночы твар», «Цынкавыя хлопчыкі», дагэтуль не выдаецца ў сябе на радзіме, хаця яе творы перакладзены на сто моваў свету, а па накладах выданняў яна не саступае найвыбітным замежным літаратарам.

Як адзначыў кіраўнік расійскага выдавецтва «Время» Барыс Пастарнак, у яго нават не было сумневу, ці брацца за выданне твораў Алексіевіч. «Яна — адна з самых выдаваемых у свеце рускамоўных літаратарак, творы якой у перакладах выдаюцца ў Францыі, Германіі, США, яна — грамадзянка Свету, пісьменнік Свету, чалавек Свету», — сказаў поўны цёзка расійскага класіка.

Даўняя сяброўка Святланы Алексіевіч, намесніца галоўнага рэдактара «Российской газеты», былая жыхарка Мінска Ядзвіга Юферава адзначыла: «Калі Святлана прыязджае ў Маскву, ці даводзіцца з ёй сустракацца на Франкфурцкім кніжным кірмашы, яна часта вядзе дыялогі з інтэлектуаламі і пачуваецца з імі нароўна. Ёсць гонар за Беларусь, што мы годныя людзьмі звацца ў гэтым свеце, за мужнасць думкі Святланы, за тое, што яна ўваходзіць у кола еўрапейскіх інтэлектуалаў, за тое, што яна асэнсоўвае ўсе нялёгкія праблемы чалавецтва і чалавечнасці».

«Я рада, што амаль праз 15 год я дома і магу гаварыць са сваімі людзьмі. Я вельмі засумавалася, — сказала Святлана Алексіевіч, звяртаючыся да прысутных. — Зараз я пішу новую кнігу «Час сэканд-хэнд. Канец «чырвонага» чалавека». Гэта кніга пра час, які мы з вамі пражылі за апошнія дваццаць год. Для мяне гэта былі складаныя гады, і не таму, што канфлікт з уладай, часам і канфлікты з маімі героямі, якія таксама ва ўладзе свайго часу, ва ўладзе нейкіх маніпуляцый, што робяць над імі. Мы ўсе безабаронныя перад сваім часам, перад краінай, у якой мы аказваемся, перад уладай, якая тут ёсць. З аднаго боку, ёсць наша адзінае жыццё, а з іншага боку — мы вельмі залежым ад таго, што ёсць сёння і зараз».



Чарга за аўтографамі да Сятланы Алексіевіч

На думку Святланы Алексіевіч, стварыць лепшую будучыню для чалавека можа толькі ён сам, і пачынаць любыя змяненні трэба з самога сябе: «Што я бачу са свайго акна ў Берліне? Прыходзяць немцы — адзін за адным — і пачынаюць будаваць дзяржаву. Што гэта такое? Стаяць пяць кантэйнераў, у адным — пластыкавыя бутэлькі, у другім — шкляныя, у трэцім — жывая арганіка. То бок, немец стаіць і будуе сваю дзяржаву, ён не кідае ўсё гэта разам, маўляў, гэта не яго праблема, а справа дзяржавы. Немцы ідуць на працу, і калі парушаюць іх інтарэсы, яна самаарганізуюцца — два, тры чалавекі, сто, тысяча… То бок, улада будзе такой, якой будзем мы».

На думку пісьменніцы, сёння галоўнае ў жыцці — выхаванне ў сабе пачуцця свабоды, але, у першую чаргу, пачуцця адказнасці. «Калі мы не будзем свабоднымі людзьмі, калі мы не будзем дастойна гаварыць з тым жа начальнікам, калі мы не будзем дастойна гаварыць з тым жа прадаўцом і з усімі астатнімі, калі нашу апазіцыю будзе клапаціць толькі тое, што пра яе думае нехта там далёка, а не тое, што пра яе думаюць у Стоўбцах, то і праз пяцьдзесят год для нас галоўнымі будуць «чарка і шкварка». Нам кожнаму патрэбна пачуццё адказнасці, і ўсе мае кнігі пра гэта», — падкрэсліла Святлана Алексіевіч.

Па аўтографы вялікай пісьменніцы людзі ішлі яшчэ некалькі гадзін пасля завяршэння прэзентацыі.

ПАДЗЕЯ

# ЗНАК БЯДЫ І РАДАСЦІ

Вольга ХВОІН

**У межах міжнароднай кніжнай выставы «Кнігі Беларусі–2009» адбылася знакавая для беларускага літаратурнага поля падзея — прэзентацыя поўнага збору твораў Васіля Быкава. Знакавасць, аднак, двухсэнсоўная. З аднаго боку, не можа не радаваць, што нарэшце з'явіўся выдавец, які ўзяў на сябе адказнасць за тое, каб пабачыла свет уся літаратурная спадчына народнага пісьменніка, з іншага — прыкра, што не знайшлося такіх сярод беларускіх майстроў друку, бо праект ажыццяўляе расійскае выдавецтва «Время».**



Пашкевіч, Аляксандар Казулін, Барыс Пастэрнак

Маленькі павільёнчык на стэндзе выдавецтваў Расіі не змог змясціць усіх, хто хацеў папрысутнічаць на імпрэзе. Пісьменнікі і чытачы стаялі поплеч у цесным памяшканні. Відаць, не знайшлося ў краіне прасторнай залі ў якім-кольвек палацы, уладальніку якога было б за гонар арганізаваць сустрэчу са спадчынай Васіля Быкава — чалавека, якога неадночы называлі сумленнем Беларусі.

Генеральны дырэктар выдавецтва «Время», журналіст Барыс Пастэрнак расказаў, што поўны збор твораў Васіля Быкава выйдзе ў чатырнаццаці тамах. Гэта не толькі знакамітыя аповесці і апавяданні, але і кінасцэнары, нарысы, інтэрв'ю, крытычныя артыкулы, публіцыстыка, вялікая перапіска з рэспандэнтамі з розных краінаў свету. «Нам гэтыя аўтары падаюцца абсалютна расійскімі. У нас адзіная літаратурная прастора, мы разам раслі, людзі адных пакаленняў. І падаецца дзіўным, калі перакладаецца і выдаецца многа літаратуры Заходняй Еўропы, і так мала ўвагі надаецца творцам сумежных краін», — патлумачыў Барыс Пастэрнак рашэнне выдавецтва ўзяцца за беларускі праект.

Кіраўнік і ініцыятар праекта Аляксандр Казулін падкрэсліў, што сумленне — адна з найвялікшых маральных каштоўнасцяў, а Васіль Быкаў — гэта сумленне нацыі, народа. Увасабленнем у рэчаіснасць ідэі выдаць поўны збор твораў народнага пісьменніка ён заняўся яшчэ ў 2005 годзе на знак памяці і пашаны.

Сёмы і восьмы тамы збору, якія толькі-толькі выйшлі з друку, уключаюць па сутнасці дэбютныя апавяданні Васіля Уладзіміравіча. Восьмы том увабраў у сябе мемуарную прозу — «Доўгая дарога дадому» з усімі праўкамі аўтара, «Парадоксы жыцця» і «Пункціры жыцця». Як адзначыў старшыня Саюзу беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч, «у гэтых творах бачна разнасцежжа пісьменніка, калі іх чытаць адзін за адным, то можна адсачыць ідэйны пошук, пабачыць, як вырас класік». «Не многім пісьменнікам шанцуе пасля смерці заставацца ў памяці чытача. Добра, як год праз дваццаць выйдзе якая кніга. Выданне твораў Васіля Быкава было здзейснена, як і належыць па велічыні таленту, па тым, што ён зрабіў для нашай дзяржавы, народа, — падкрэсліў паэт і публіцыст Сяргей Законнікаў у сваім выступе перад чытачамі і выдаўцамі. — Такія рэчы, як «Доўгая дарога дадому», цікавыя не толькі для шараговага чытача, але і для літаратуразнаўцаў, бо ёсць дэталі, якія расказваюць пра тое, як ствараліся творы, зафіксаваныя эмоцыі пісьменніка найперш як чалавека».

Здзіўляе, што ніводнае дзяржаўнае выдавецтва не дадумалася выдаць поўны збор твораў Васіля Быкава. Прыватныя беларускія выдавецтвы за апошнія гады выпусцілі толькі асобныя творы Васіля Уладзіміравіча: «Парадоксы жыцця», «Пахаджане», «Сцяна», «Доўгая дарога дадому», у літаратурным часопісе «Дзеяслоў» друкаваліся малавядомыя творы пісьменніка. Разам з тым, генеральны дырэктар выдавецтва «Время» Барыс Пастэрнак з задавальненнем адзначыў: «Кнігі карыстаюцца добрым попытам. Нават на выставе іх разбіраюць бы гарачыя піражкі». Барыс Пастэрнак паведаміў, што выдавецтва гатовае прапанаваць збор твораў беларускім бібліятэкам. Пытанне, ці захочуць міністэрствы інфармацыі ці адукацыі ўзяць на сябе арганізацыйную працу, каб развезці кнігі па ўсёй Беларусі да чытачоў.

Мяркуецца, што ў наступным годзе выдаўцы скончаць праект. У задуме — выдаць поўны збор твораў Васіля Быкава і на рускай мове.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 23 ЛЮТАГА, ПАНЯДЗЕЛАК

**05.30** Дакументальна-пазнавальны серыял «Таямнічы свет жывёл» (Францыя).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Nota Bene.
**09.35** Здароўе.
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Я выйшла замуж за замежніка».
**11.05** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Меладрама «Толькі вярніся» (Расія).
**14.05** «Будні чэмпіёнаў».
**14.30** Відэафільм АТН «Самба - не танец».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.05** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**16.55** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.40** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50** «81-я цырымонія ўручэння прэміі «Оскар-2009».
**23.40** Вострасюжэтны серыял «Афіцэры».
**00.45** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Дыханне планеты».
**10.45** Фільм «Навальнічныя вароты».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Фільм «Навальнічныя вароты». Працяг.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Фільм «Навальнічныя вароты». Канчатак.
**14.45** Фільм «Служылі два таварышы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Фільм «Служылі два таварышы». Працяг.
**17.00** Прэм'ера. «Алег Янкоўскі. У галоўнай ролі».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Фільм «Ваенна-палявы раман».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Драма «Набрыдзь». Расія, 2006.
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Зваротны адлік». «Да-19. Час герояў».
**23.50** Прэм'ера. Фільм «Фальшываманетчыкі».
**01.35** Нашы навіны.
**01.50** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Ваенная таямніца».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Мая хата».
**14.20** «Наша справа».
**14.30** «Далёкія сваякі».
**14.45** «Фантастычныя гісторыі».
**15.35** «Я - вандроўца».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Спартовы тыдзень».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Прарыў». Расія, 2006 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**23.55** «Закон і крымінал».
**00.00** «Сталічны футбол».
**00.30** «Гучная справа».

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Тэлебарометр.
**08.40** Усё аб бяспецы.
**09.05** У гэты дзень.
**09.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.55** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.50** Ваенна-прыгодніцкі баявік «Смерш» (Расія). 1-я і 2-я серыі.
**12.35** Слова пісьменніка.
**13.05** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**13.55** Бухта капітанаў.
**14.35** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.05** «Таемны густ». Кулінарная праграма.
**15.40** «Шунін і бландынкі». Аўтамабільная праграма.
**16.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-5» (Расія).
**19.55** Беларуская часіна.
**20.55** Калыханка.
**21.15** Кінааповесць «Балада аб салдаце».
**22.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**23.55** Хакей. Формула гульні.
**00.20** Хакей КХЛ. «Дынама» (Мінск) - «Сібір» (Новасібірск).

**РОССИЯ**

**07.00** Фільм «Аляксандр Неўскі». 1938 г.
**08.50** Фільм «Самы павольны цягнік». 1963.
**10.10** «Ранішняя пошта».
**10.40** Фільм «Моцныя духам». 1967 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** Музычны фільм «Трэмбіта». 1968 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** «Салдаты, што спяваюць». Дакументальны фільм.
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.20** Святочны канцэрт, прысвечаны 20-годдзю вываду савецкіх войскаў з Афганістана.
**21.05** Навіны - Беларусь.
**21.15** Фільм «Мы з будучыні». 2008 г.
**00.25** Заканчэнне эфіру.

**НТВ**

**06.15** Гісторыка-прыгодніцкі баявік «Апошні легіён».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Следства вялі...».
**09.05** «Кватэрнае пытанне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Чапаева ліквідаваць». Дакументальны фільм.
**11.15** Вострасюжэтны серыял «Афганская здань».
**13.00** Сёння.
**13.20** Вострасюжэтны серыял «Афганская здань».
**16.00** Сёння.
**16.25** Вострасюжэтны серыял «Афганская здань».
**18.35** «Прафесія-рэпарцёр».
**19.00** Сёння.
**19.30** Баявік «Спецпрызн. Паслушнік».
**20.30** Баявік «Вікінг».
**22.15** Прэм'ера. «Ржэў. Невядомая бітва Георгія Жукава».
**23.35** Прэм'ера. Гістарычная драма «Берыя. Пройгрыш».
**00.30** Дэтэктыўны серыял «Лікі».

**EUROSPORT**

**09.30** Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.
**09.45** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Мужчыны. 30 км. Гонка пераследу.
**10.45** Лыжнае дваяборства. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). 10 км. Мас-старт.
**11.45** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі (Пьонг Чанг). Жанчыны. Мас-старт.
**12.30** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі (Пьонг Чанг). Мужчыны. Эстафета.
**14.00** Снукер. Адчынены чэмпіянат Уэльса (Ньюпорт, Вялікабрытанія). Фінал.
**16.00** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі (Пьонг Чанг). Жанчыны. Мас-старт.
**16.30** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі (Пьонг Чанг). Мужчыны. Эстафета.
**18.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Мужчыны. 30 км. Гонка пераследу.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Еўрагалы. Адмысловы выпуск.
**20.00** Снукер. Адчынены чэмпіянат Уэльса (Ньюпорт, Вялікабрытанія). Фінал.
**21.15** Вось дык так!!!
**21.30** Армрэстлінг. PAL/NAL.
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection.
**23.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Total Knock Out.
**00.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**01.15** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Мужчыны. Эстафета.

## 24 ЛЮТАГА, АЎТОРАК

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Двайняты».
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**10.50** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**11.40** Відэафільм АТН «Маладзечанскі крыж» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**13.05** Камедыйны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Двайняты».
**16.55** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Інтэр - Манчэстэр Юнайтэд. Прамая трансляцыя.
**23.40** Дзень спорту.
**00.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд дня.
**00.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Ліён -- Барселона.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Няволя мая балазе, і цяжар мой лёгкі». Апошняя гутарка з Патрыярхам Алексіем ІІ.
**10.00** «Людміла Зыкіна. Як не кахаць мне гэтую зямлю...».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**15.00** «Руская ў горадзе анёлаў». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання».Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Жыццё, якога не было». Шматсерыйны фільм.
**22.05** Прэм'ера. «Група ZETA». Шматсерыйны фільм.
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Эмігранты. Шлях дадому».
**00.20** «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.55** Фільм «Прарыў». Расія, 2006 г.
**10.40** «Закон і крымінал».
**10.50** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Гучная справа».
**13.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.35** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** «Атрад». Серыял.
**22.00** «Рэпарцёр СТБ».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.25** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.20** «Закон і крымінал».
**00.25** «Рэактыўны бокс».
**00.55** «Надзвычайныя гісторыі».

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-5» (Расія).
**09.15** У гэты дзень.
**09.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.05** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**11.50** Хакей. Формула гульні.
**12.15** Ваенна-прыгодніцкі баявік «Смерш».
**14.15** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**14.50** Мультфільм.
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Бітва экстрасэнсаў.
**16.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-5» (Расія).
**19.55** Беларуская часіна.
**20.55** Калыханка.
**21.15** Кінараман «Каханне зямное» (СССР).
**23.00** Спорт-кадр.
**23.30** Дак. фільм «За чыстую пятніцу».

**РОССИЯ**

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**08.40** Фільм «Яго батальён». 1989 г.
**11.00** Весткі.
**11.30** Пакой смеху.
**12.30** Лірычная камедыя «Сустрэнемся ў фантана». 1976 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** Прэм'ера. «Няскончаная песня. Юрый Гуляеў». Дакументальны фільм.
**15.50** «Асцярожна, мозг!». Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Вандраванні натураліста».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**20.30** Тэлесерыял «Гаішнікі».
**21.40** Тэлесерыял «Мамука».
**22.40** «Кулагін і партнёры».
**23.15** «Весткі+».
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** «Дзеяць жыццё - дзеяць турботу...». Кастусь Зубоў. Дакументальны фільм.
**00.30** Заканчэнне эфіру.

**НТВ**

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.05** «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
**10.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.50** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.15** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Двое з куфара. Праверка на трываласць».
**12.05** Гістарычная драма «Берыя. Пройгрыш».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Шпіёнскія гульні».
**15.15** «Проста цырк».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Вострасюжэтны баявік «Марскія д'яблы».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.35** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**19.40** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Святаяннік».
**21.45** «Вочная стаўка».
**22.35** «Ты не паверыш! Ньюс».
**23.25** Прэм'ера. Гістарычная драма «Берыя. Пройгрыш».
**00.20** Дэтэктыўны серыял «Лікі».

**EUROSPORT**

**09.30** Экстрэмальны спорт. Моладзевая зона.
**10.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.45** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Мужчыны. 30 км. Гонка пераследу.
**12.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Кваліфікацыя. Камандныя спаборніцтвы. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**13.00** Лыжнае дваяборства. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). 10 км. Мас-старт.
**14.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Спрынт класічным стылем. Фінал. Прамая трансляцыя.
**15.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**16.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Групавы этап. Дзень 6-ы. «Ліён» (Францыя) - «Баварыя» (Мюнхен, Германія).
**17.30** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі (Пьонг Чанг). Мужчыны. Эстафета.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Спрынт класічным стылем. Фінал.
**20.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**21.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна Еўропы ў Італіі (Мілан).
**22.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна па версіі IBF у Канадзе (Мельбурн).
**00.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Спрынт класічным стылем. Фінал.
**01.00** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі (Пьонг Чанг). Мужчыны. Эстафета.
**02.15** Вось дык так!!!

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 25 ЛЮТАГА, СЕРАДА

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Двайняты» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.00** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**10.50** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**11.40** «Еўрафэст. Дзень за днём».
**12.10** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**13.05** Камедыйны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Альманах вандраванняў.
**14.30** Камедыйны серыял «Офіс» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Двайняты» (Расія).
**16.55** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**20.50** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Чэлсі -- Ювентус. Прамая трансляцыя.
**23.40** Дзень спорту.
**00.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд дня.
**00.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Рэал -- Ліверпуль.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.50** «Шалапутныя нататкі».
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** Фазэнда.
**11.35** Разумніцы і разумнікі.
**12.20** «Ранішняя пошта».
**13.10** «Дарослыя казкі аб жывёлах». Дакументальны фільм.
**13.40** «Зваротны адлік».
**14.10** Камедыя «Іван Васільевіч змяняе прафесію».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. Юбілейны канцэрт групы «Любэ».
**18.10** Прэм'ера. Меладрама «Матчын інстынкт».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Дыханне планеты».
**21.40** «Апошні герой: Забытыя ў раі».
**22.55** «Камедзі Клаб».
**23.30** Прыгодніцкі фільм «Міф».

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Атрад». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Закон і крымінал».
**10.50** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Надзвычайныя гісторыі».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Рэпарцёр СТБ».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.35** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэактыўны бокс».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Дабро пажалiцца».
**20.55** «Атрад». Серыял.
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.25** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.20** «Закон і крымінал».
**00.25** Тэніс. Кубак Федэрацыі 2009.
**01.25** «Дэтэктыўныя гісторыі».

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-5» (Расія).
**09.20** У гэты дзень.
**09.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.00** Свая музыка.
**11.25** Пасоўванне+.
**11.55** Спорт-кадр.
**12.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Арсенал» - «Рома».
**14.10** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.10** «Касмаполітэн». Відэаверсія.
**16.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-5» (Расія).
**19.55** Беларуская часіна.
**20.55** Калыханка.
**21.15** Кінараман «Лёс» (СССР). 1-я серыя.
**23.05** «Іншыя». «Родная кроў».
**23.35** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) - «Металург» (Новакузнецк).
**01.25** Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** Тэлесерыял «Карменіта».
**10.05** Тэлесерыял «Гаішнікі».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Мамука».
**12.25** Фільм «Перад світанкам». 1989 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** «Моцарт». Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Хто ў хаце гаспадар».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Карменіта».
**20.30** Тэлесерыял «Даішнікі».
**21.40** Тэлесерыял «Мамука».
**22.40** «Кулагін і партнёры».
**23.15** «Весткі+».
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** Прэм'ера. «Ніхто не жадаў забываць. Бурдайціс, Банёніс і іншыя». Дакументальны фільм.
**00.40** Заканчэнне эфіру.

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.05** «Вочная стаўка».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Асоба небяспечны!».
**10.55** «Галоўная дарога».
**11.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Двое з куфара. Праверка на трываласць».
**12.05** Гістарычная драма «Берыя. Пройгрыш».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Шпіёнскія гульні».
**15.10** «Проста цырк».
**15.35** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Вострасюжэтны баявік «Марскія д'яблы».
**18.15** «Ты не паверыш! Ньюс».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Святаяннік».
**21.40** «І зноў добры дзень!».
**22.35** «Ты не паверыш! Ньюс».
**23.00** Сёння.
**23.25** Прэм'ера. Гістарычная драма «Берыя. Пройгрыш».
**00.20** Дэтэктыўны серыял «Лікі».

**09.30** Снукер. Адчынены чэмпіянат Уэльса (Ньюпорт, Вялікабрытанія). Фінал.
**11.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Спрынт класічным стылем. Фінал.
**12.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Спрынт. Кваліфікацыя. Камандныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**13.00** Снукер. Адчынены чэмпіянат Уэльса (Ньюпорт, Вялікабрытанія). Фінал.
**14.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Спрынт. Камандныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**15.30** Футбол. Кубак УЕФА. 1/16 фіналу. Першыя матчы.
**16.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ньюпорт, Вялікабрытанія). Фінал.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Спрынт. Камандныя спаборніцтвы.
**20.30** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.45** Вось дык так!!!
**21.00** Абранае па серадах.
**21.05** Конны спорт. Кубак свету ў Іспаніі (Віга). Канкур.
**22.05** Конны спорт. Кубак свету ў Швецыі (Готэнбург). Канкур.
**23.05** Навіны коннага спорту.
**23.10** Гольф. Тур PGA. Турнір Northern Trust Open (Лос-Анджэлес, ЗША).
**00.10** Гольф. Еўрапейскі тур. Джоні Уокер. Класік (Пхукет, Тайланд).
**00.40** Гольф-клуб.
**00.45** Яхт-клуб.
**00.55** Абранае па серадах.
**01.00** «Спартовы курорт». Часопіс.
**01.15** «Спартовы вандроўца». Часопіс.
**01.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Спрынт. Камандныя спаборніцтвы.

## 26 ЛЮТАГА, ЧАЦВЕР

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Двайняты».
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**10.50** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**11.40** Відэафільм АТН «Прывіды Лідскага замка» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**13.05** Камедыйны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Уласнай персонай.
**14.30** Камедыйны серыял «Офіс» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Двайняты» (Расія).
**16.55** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Вострасюжэтны серыял «Афіцэры» (Расія).
**00.05** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсер. фільм. 38-я серыя.
**10.05** «Жыццё, якога не было». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**15.00** «Руская ў горадзе анёлаў». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**18.55** «Рудая». Шматсер. фільм. 39-я серыя.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Жыццё, якога не было». Шматсерыйны фільм.
**22.05** Прэм'ера. «Група ZETA». Шматсерыйны фільм.
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Злачынствы стагоддзя».
**23.50** «Геніі і злыдні».
**00.20** «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажалiцца».
**08.50** «Атрад». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Закон і крымінал».
**10.50** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20** Тэніс. Кубак Федэрацыі 2009.
**14.50** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.35** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Малая Радзіма». Глыбокае.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** «Атрад». Серыял.
**22.00** «Асабістыя інтэрас».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.25** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.20** «Закон і крымінал».
**00.25** «Гарачы лёд».
**00.55** «Сакрэтныя гісторыі».

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-5» (Расія).
**09.20** У гэты дзень.
**09.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.15** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.10** «Невытлумачальна, але факт».
**12.00** «Медычныя таямніцы».
**12.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Спортынг - Баварыя.
**14.20** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**15.10** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.50** Пазакласная гадзіна.
**16.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-5» (Расія).
**19.55** Беларуская часіна.
**20.55** Калыханка.
**21.15** Кінараман «Лёс» (СССР). 2-я серыя.
**22.40** Час футбола.
**23.10** «Проста праграма».
**23.50** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) - «Металург» (Новакузнецк).

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** Тэлесерыял «Карменіта».
**10.00** Тэлесерыял «Даішнікі».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Мамука».
**12.30** Фільм «Сямейная меладрама».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** «Чаканне імператрыцы». Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Відавочнае-неверагоднае».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Карменіта».
**20.30** Тэлесерыял «Даішнікі».
**21.40** Тэлесерыял «Мамука».
**22.40** «Кулагін і партнёры».
**23.15** «Весткі+».
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** «Ген агрэсіі і мова цела». Дакументальны фільм.
**00.35** Заканчэнне эфіру.

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**09.05** «І зноў добры дзень!».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Цуд-людзі».
**10.50** «Дужанне за ўласнасць».
**11.15** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Двое з куфара. Праверка на трываласць».
**12.05** Гістарычная драма «Берыя. Пройгрыш».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Шпіёнскія гульні».
**15.05** «Проста цырк».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Баявік «Марскія д'яблы».
**18.10** «Ты не паверыш! Ньюс».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Святаяннік».
**21.40** «Да бар'ера!».
**22.50** «Ты не паверыш! Ньюс».
**23.00** Сёння.
**23.25** Прэм'ера. Гістарычная драма «Берыя. Пройгрыш».
**00.20** Дэтэктыўны серыял «Лікі».

**09.30** «Спартовы курорт». Часопіс.
**09.45** Футбол. Кубак УЕФА. 1/16 фіналу. Першыя матчы.
**10.45** Лыжнае двааборства. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). 10 км па сістэме Гундэрсена. Скачкі з трампліна.
**12.00** Лыжнае двааборства. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Скачкі з трампліна. HS 134. Камандныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**13.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Спрынт. Камандныя спаборніцтвы.
**14.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Жанчыны. 4x5 км класічным/вольным стылямі. Прамая трансляцыя.
**15.15** Лыжнае двааборства. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Скачкі з трампліна. HS 134. Камандныя спаборніцтвы.
**16.15** Лыжнае двааборства. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Камандныя спаборніцтвы. 4x5 км. Прамая трансляцыя.
**17.15** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Жанчыны. 4x5 км класічным/вольным стылямі.
**18.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). HS 134. Кваліфікацыя. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Жанчыны. 4x5 км класічным/вольным стылямі.
**20.15** Лыжнае двааборства. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Камандныя спаборніцтвы. 4x5 км.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір Klash. Фінал.
**00.00** Футбол. Кубак УЕФА. 1/16 фіналу. Зваротныя матчы. Агляд.
**01.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першыя матчы.

## 27 ЛЮТАГА, ПЯТНІЦА

05.10 Дэтэктыўны серыял «Двайняты» (Расія).
06.00 Навіны.
06.02, 07.05 Прэс-агляд.
06.05 Дзень спорту.
06.15, 07.10, 08.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
06.45, 07.45 Зона Х.
07.00 Навіны.
07.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.00 Навіны.
08.20 Гатуем разам.
08.35 Сфера інтэрасаў.
09.05, 13.55 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
09.00 Навіны.
09.10 Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
10.00 Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
10.50 Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
11.40 «Еўрафэст. Дзень за днём».
12.00 Навіны.
12.10 Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
13.00 Навіны.
13.05 Камедыйны дэтэктыўны серыял «Монк» (ЗША).
14.00 Навіны.
14.05 Шпілька.
14.30 Камедыйны серыял «Офіс» (ЗША).
15.00 Навіны.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
16.00 Навіны.
16.05 Дэтэктыўны серыял «Двайняты» (Расія).
16.55 Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Я супраць сэксу да шлюбу».
17.00 Навіны.
18.00 Навіны.
18.05 Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
19.00 Навіны.
19.30 «Зона Х». Вынікі тыдня.
19.55 Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
21.00 Панарама.
21.50 Фантастычны серыял «Героі» (ЗША).
23.35 Драма «Уваскрашаючы мерцвякоў» (ЗША).
23.55 Навіны.
01.40 Дзень спорту.

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
09.05 «Рудая». Шматсерыйны фільм. 39-я серыя.
10.05 «Жыццё, якога не было». Шматсерыйны фільм.
11.00 Нашы навіны.
11.05 Навіны спорту.
11.10 «Кантрольны закуп».
12.00 «Малахаў+».
13.00 Нашы навіны.
13.05 Навіны спорту.
13.10 «Зразумець. Прабачыць».
13.45 «Модны прысуд».
15.00 «Руская жонка Пабла Пікасо».
16.00 Нашы навіны.
16.10 Навіны спорту.
16.15 «Агонь кахання». Шматсерыйны фільм.
17.10 «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
18.00 Нашы навіны.
18.15 Навіны спорту.
18.20 «Дакументальны дэтэктыў». «Памянушцы Кілер».
18.55 «Поле цудаў».
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 «Клуб вясёлых і знаходлівых». Вышэйшая ліга.
23.20 Нашы навіны.
23.35 Навіны спорту.
23.40 «Наша Belarussia».
00.15 Камедыя «Хата са зніжкай». Францыя, 2006 год.
02.00 Нашы навіны.
02.15 Навіны спорту.

06.00 «24 гадзіны».
06.10 «Міншчына».
06.20 «Раніца. Студыя добрага настрою».
07.30 «24 гадзіны».
07.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
08.30 «Аўтапанарама».
08.50 «Атрад». Серыял.
10.00 «Пяць гісторый».
10.30 «24 гадзіны».
10.40 «Закон і крымінал».
10.50 «Танга ўтрох». Тэленавэла.
11.45 «Багатая і каханая». Серыял.
12.35 «Прыватныя гісторыі».
13.30 «24 гадзіны».
13.50 «Асабістыя інтэрас».
14.20 Тэніс. Кубак Федэрацыі 2009.
14.50 «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
15.35 «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
16.30 «24 гадзіны».
16.50 «Гарачы лёд».
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.25 «Багатая і каханая». Серыял.
19.30 «24 гадзіны».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, маляня».
20.35 Фільм «Рыбка з імем Ванда». ЗША-Вялікабрытанія, 1988 г.
22.30 «24 гадзіны».
22.55 «СТБ-спорт».
23.00 «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнесу.
23.40 Фільм «20 цыгарэт». Расія, 2007 г.

06.55 Ранішняя падзарадка.
07.55 Смачна з Барысам Бурдой.
08.25 Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-5» (Расія).
09.20 Час футбола.
09.45 У гэты дзень.
09.50 Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
10.45 Іранічная меладрама «Шоў для самотнага мужчыны» (СССР).
12.30 «Спрадвечнае. Абрад «Маслёнка». Дакументальны фільм (Беларусь).
12.40 «Лабірынты: Самуэль Кміціч - аршанскі харунжы».
13.10 Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
14.00 Дак. фільм «За чыстую пятніцу» (Беларускае тэлебачанне).
14.30 Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
14.50 Мультфільм.
15.05 Пазакласная гадзіна.
15.20 Школа рамонту.
16.10 Смачна з Барысам Бурдой.
16.35 Усё аб бяспецы.
17.10 Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
18.10 Навіны культуры.
18.25 Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Юнасць - Ліепаяс Металургс. Прамая трансляцыя.
20.45 Калыханка.
21.10 Бітва экстрасэнсаў.
22.15 «Грандыёзная гонка». Забаўляльная праграма (ЗША).
23.10 Камедыйная меладрама «Анатомія Грэй» (ЗША).

07.00 Добрай раніцы, Расія!
09.15 Тэлесерыял «Карменіта».
10.00 Тэлесерыял «Даішнікі».
11.00 Весткі.
11.30 Тэлесерыял «Мамука».
12.30 Фільм «Стаянка цягніка - дзве хвіліны». 1972 г.
13.50 Навіны - Беларусь.
14.00 Весткі.
14.20 «Кулагін і партнёры».
14.55 «Мне сніцца рускі снег...». Дакументальны фільм.
16.50 Навіны - Беларусь.
17.00 Весткі.
17.25 «Гарадок». Дайджэст.
17.55 «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
18.50 Навіны - Беларусь.
19.00 Весткі.
19.30 «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
21.25 Прэм'ера. Вострасюжэтны фільм «Шлях дадому». 2008 г.
23.20 Навіны - Беларусь.
23.30 Камедыя «Герай яе рамана». 2001 г.
01.00 Заканчэнне эфіру.

06.00 Сёння.
06.05 Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
09.05 «Галоўны герой».
10.00 Сёння.
10.25 «Жаночы погляд».
10.50 «Авіятары».
11.15 Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Двое з куфара. Праверка на трываласць».
12.05 Гістарычная драма «Берыя. Пройгрыш».
13.00 Сёння.
13.30 Дэтэктыўны серыял «Шпіёнская гульня».
15.05 «Проста цырк».
15.35 «Агляд. Выратавальнікі».
16.00 Сёння.
16.30 Вострасюжэтны баявік «Марскія д'яблы».
18.20 «Ты не паверыш! Ньюс».
18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.00 Сёння.
19.40 Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Святаяннік».
21.35 Драма «Вавілон».
00.05 Крымінальны трылер «Яны».
01.30 «Наша тэма».

09.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першыя матчы.
10.30 Футбол. Еўрагалы. Адмысловы выпуск.
10.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першыя матчы.
12.00 Горныя лыжы. Кубак свету ў Балгарыі (Банско). Жанчыны. Хуткасны спуск. Прамая трансляцыя.
13.30 Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). HS 134. Кваліфікацыя.
14.00 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Мужчыны. 4х10 км класічным/вольным стылямі. Прамая трансляцыя.
16.00 Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). HS 134. Трэніроўка. Прамая трансляцыя.
16.45 Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). HS 134. Прамая трансляцыя.
19.00 Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
19.30 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Мужчыны. 4х10 км класічным/вольным стылямі.
20.45 Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). HS 134.
22.00 «Наймоцныя людзі планеты». Ліга чэмпіёнаў (Украіна).
23.00 Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
23.30 Армрэстлінг. PAL/NAL.
00.00 Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
00.30 Экстрэмальны спорт. TTP TУР.
01.00 Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). HS 134.
01.45 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Мужчыны. 4х10 км класічным/вольным стылямі.

## 28 ЛЮТАГА, СУБОТА

06.25 Моладзевы серыял «Сэрца акіяну» (Францыя).
06.50 Брытва Окама.
07.15 Існасць.
07.45 Дзень спорту.
07.55 «Добрай раніцы, Беларусь!».
08.45 Гатуем разам.
09.00 Навіны.
09.10, 12.15 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
09.15 Здароўе.
09.45 Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
10.15 Шпілька.
10.50 Ранішняя хваля.
11.30 «Вынікі Берлінскага кінафэсту». Фільм 1-ы.
12.00 Навіны.
12.20 Кінааповесць «З табой і без цябе» (СССР).
14.00 Дакументальны серыял «Таямніцы забытых перамог» (Расія).
14.25 Футбол. Чэмпіянат свету-2010. Відэачасопіс.
15.00 Навіны.
15.10 Навіны рэгіёна.
15.35 Вакол планеты.
16.20 «Зона Х». Вынікі тыдня.
16.40 Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
17.45 Відэафільм АТН «Таямніцы зямлі Обраў» цыклу «Зямля беларуская».
18.00 Навіны.
18.25 «Ваша лато».
19.15 Латарэя «Пяцёрачка».
19.30 «Мінскі джаз-2009».
21.00 Панарама.
21.45 Відэафільм АТН «Прабач мяне».
22.10 Мастацкі фільм у рубрыцы «Фільм тыдня». Крымінальная драма «Мара Касандры» (ЗША - Вялікабрытанія - Францыя).
00.15 «Уласнай персонай».
00.45 Моладзевы гумарыстычны серыял «Клава, давай!» (ЗША). Заключныя серыі.

07.00 АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
08.00 Нашы навіны.
09.00 Нашы навіны.
09.05 «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
09.35 «Здароўе».
10.20 «Смак».
11.00 «Кветкі як цуд». Дак. фільм.
11.30 «Жыццё без болю».
12.10 «Хітры Джэк». Анімацыйны фільм.
13.25 Тэлечасопіс «Саюз».
13.55 «Кінаметры вайны». «Свет чужымі вачамі. Трэцяя ракета».
14.25 «Трэцяя ракета». Мастацкі фільм.
16.00 Нашы навіны.
16.10 Навіны спорту.
16.15 Вялікая палітыка.
16.45 «Аляксей Баталаў. Дарагі наш чалавек».
17.45 Меладрама «Каралева лёду». Расія, 2008 год.
19.35 АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 Прэм'ера. Фільм «Унук касманаўта».
22.40 «Пражэктарпэрысхілтан».
23.20 Фільм «Хрыбет Д'ябла».

06.40 «Ваенная таямніца».
07.30 «Вовачка». Камедыйны серыял.
08.25 Прыгодніцкі фільм «У пошуках капітана Гранта». СССР, 1985 г. 4 -ая серыя.
09.30 «Мая хата».
10.00 «Крокі да поспеху».
11.00 «Мінск і мінчане».
11.30 «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
12.30 «Новыя прыгоды дылетанта».
13.00 Фільм «Мой далікатна каханы дэтэктыў». СССР, 1986 г.
14.40 «Дарагая перадача».
15.35 «Відавочнік прадстаўляе: самае шакавальнае».
16.30 «24 гадзіны».
16.40 «Наша справа».
16.50 «Народжаныя ў СССР».
17.40 «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
18.30 «Я - вандроўца».
19.00 «Ля параднага пад'езду».
19.30 «24 гадзіны».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 Фільм «Бессань». ЗША, 2002 г.
22.10 Канцэрт М.Задорнава: «Задорнава да адказу!».
23.15 Фільм «Недарэчны чалавек». Нарвегія-Ісландыя, 2006 г.
00.50 Фільм «Апанаванасць». ЗША, 2000 г.

07.45 Дакументальна-пазнавальны серыял «Сардэчна запрашаем у маю краіну» (Францыя).
08.15 Серыял для дзяцей «Олівер Твіст» (Вялікабрытанія-ЗША).
09.00 Свая кампанія.
10.05 «Таемны густ». Кулінарная праграма.
10.35 «Шунін і бландынкі». Аўтамабільная праграма.
11.10 Жаночая ліга.
11.40 Школа рамонту.
12.35 Невытлумачальна, але факт.
13.30 Лабірынты: Катранская пушча.
13.55 Запал па культуры. Ток-шоў.
14.40 Спорт, спорт, спорт...
15.10 Прыгодніцкі фільм «Скачок гепарда» (ЗША).
16.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Мідлсбро - Ліверпуль. Прамая трансляцыя.
18.55 Касмаполітэн. Відэаверсія.
19.55 Камедыя «Прыватны дэтэктыў, або Аперацыя «Кааперацыя» (СССР).
21.45 Жаночая ліга.
22.10 Камедыя «Народжаная ўчора, або Урокі кахання» (ЗША - Аўстралія).
00.05 «Казанова». Тэлечасопіс для мужчын.

07.00 Весткі.
07.10 Дэтэктыў «Суровыя кіламетры». 1969 г.
08.45 «Мой срэбны шар».
09.40 «Суботнік».
10.25 «Ранішняя пошта».
11.00 Весткі.
11.10 Фільм «Бар'ер». 1979 г.
13.00 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэнне». Фільм 10, «Аптэчная карта». 1 серыя.
14.00 Весткі.
14.20 Фільм па матывах твораў Аркадзя Гайдара «Бумбараш».1971 г.
16.45 Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
19.00 Весткі ў суботу.
19.40 «Суботні вечар».
21.35 Прэм'ера. Вострасюжэтны фільм «Стрытрэйсеры». 2008 г.
23.45 Фільм «Неспадзяванка Белі». 2002 г.
01.55 Заканчэнне эфіру.

07.30 Мультфільмы.
08.00 Сёння.
08.20 «Казкі Бажэнава».
08.45 Мультфільм.
08.55 «Агляд».
09.25 «Без рэцэпту».
10.00 Сёння.
10.25 «Галоўная дарога».
10.55 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.00 Сёння.
13.30 «Асоба небяспечны!».
14.10 Камедыя «Кактус».
16.00 Сёння.
16.25 «Жаночы погляд».
17.05 Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак: Злачынны намер».
19.00 Сёння.
19.30 «Прафесія-рэпарцёр».
20.00 «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
21.05 «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
22.00 «Ты не паверыш!».
22.55 Трылер «Забі мяне».
00.35 Сатырычная камедыя «Дарога на Вэлвіл».

09.30 Санкавы спорт. Кубак свету ў Канадзе (Ванкувер). Агляд.
10.00 Горныя лыжы. Кубак свету ў Славеніі (Краньска Горка). Мужчыны. Слалам-гігант. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
11.00 Біятлон. Чэмпіянат Еўропы ў Расеі (Уфа). Жанчыны. Спрынт.
12.00 Лыжнае дваяборства. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). HS 134. Прамая трансляцыя.
13.00 Горныя лыжы. Кубак свету ў Славеніі (Краньска Горка). Мужчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
14.15 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Жанчыны. 30 км вольным стылем. Мас-старт. Прамая трансляцыя.
15.30 Лыжнае дваяборства. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). HS 134.
16.00 Лыжнае дваяборства. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). 10 км. Мас-старт. Прамая трансляцыя.
16.45 Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). HS 134. Камандныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
19.00 Біятлон. Чэмпіянат Еўропы ў Расеі (Уфа). Жанчыны. Спрынт.
20.00 Біятлон. Чэмпіянат Еўропы ў Расіі (Уфа). Мужчыны. Спрынт.
21.00 Тэніс. Турнір ATP у ЗША. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
23.00 Бокс. Міжнародны паядынак у ЗША.
00.00 Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір Klash. Фінал.
02.15 Супербайк. Чэмпіянат свету ў Аўстраліі. Суперпоул.
03.00 Супербайк. Чэмпіянат свету ў Аўстраліі. Заезд 1-ы. Прамая трансляцыя.

## 1 САКАВІКА, НЯДЗЕЛЯ

---

**06.30** Моладзевы серыял «Сэрца акіяну» (Францыя).
**06.55** Меладрама «У адзін выдатны дзень» (Югаславія).
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05, 15.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Арсенал.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.10** Культурныя людзі.
**10.45** У свеце матораў.
**11.15** «Вынікі Берлінскага кінафэсту». Фільм 2-і.
**11.45** «Еўрафэст. Дзень за днём».
**12.10** Лірычная камедыя «Трын-трава» (СССР).
**13.50** Хакей для ўсіх.
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Nota Bene.
**16.00** Прыгодніцкая камедыя «Дарога дадому-2. Страчаныя ў Сан-Францыска» (ЗША).
**17.45** Суперлата.
**18.45** Меладрама «Даравaная нядзеля» (Украіна).
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**23.05** Прыгодніцкі баявік «Бэтмен вяртаецца» (ЗША - Вялікабрытанія).

---

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.45** «Шалапутныя нататкі».
**10.05** Пакуль усе дома.
**10.55** Фазэнда.
**11.30** Разумніцы і разумнікі.
**12.10** «Ранішняя пошта».
**12.40** «Зваротны адлік». «Маўчанне карцін. У пошуках згубленага».
**13.10** Прэм'ера. «Карнавал лёсу Ірыны Мураўёвай».
**14.10** Фільм «Вялікі капкан, або Сола для коткі пры поўным месяцы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Новыя песні аб галоўным».
**18.00** Прэм'ера. Фільм «Мой восеньскі блюз».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Дыханне планеты».
**21.40** «Апошні герой: Забытыя ў раі».
**22.55** «Камедзі Клаб».
**23.30** Прэм'ера. Фільм «Аднойчы ў Галівудзе».

---

**06.50** «Вовачка». Камедыйны серыял.
**07.40** Фільм «Рыбка з імем Ванда». ЗША-Вялікабрытанія, 1988 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Добры дзень, доктар!».
**13.00** Фільм «Прывітанне, маляня!». Расія, 2001 г.
**14.40** «Дарагая перадача».
**15.05** «Культурнае жыццё».
**15.35** «Прыватныя гісторыі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэтраманія».
**18.00** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Фільм «Балівуд - Галівуд». Канада-Індыя, 2002 г.
**22.25** «Спартовы тыдзень».
**22.55** Настольны тэніс. Ліга нацый. Мужчыны. Беларусь-Германія.
**00.00** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**08.10** Дабравест.
**08.40** Мір вашай хаце.
**08.50** Бухта капітанаў.
**09.30** Наша пяцёрачка.
**10.00** Мультфільм.
**10.20** Фантастычны серыял «Госця з будучыні» (СССР). 1-я серыя.
**11.30** Медычныя таямніцы.
**12.05** Гаспадар.
**12.35** Спорт, спорт, спорт...
**13.05** Хакей. НХЛ. Нэшвіл - Дэтройт.
**14.45** Пасоўванне+.
**15.05** Спявай, душа.by.
**15.35** Меладраматычны серыял «Дзве зоркі» (Індыя).
**17.00** Прэм'ера. Серыял «Пачаць спачатку. Марта» (Украіна). 1 - 4, заключная, серыі.
**20.20** Тэлебарометр.
**20.40** «Правы чалавека».
**20.55** Рамантычная камедыя «Артур» (ЗША).
**22.45** Свая музыка.
**23.15** Пасоўванне +.
**23.45** Філасофская прыпавесць «Вясна, лета, восень, зіма і...зноў вясна» (Паўднёвая Карэя-Германія).

---

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.15** Фільм «Дым Айчыны». 1980 г.
**08.45** Мультфільмы.
**09.05** «Смехапанарама» Яўгенія Петрасяна.
**10.00** «Гарадок».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.00** «Хто ў хаце гаспадар».
**12.35** «Ха!» Маленькія камеды.
**13.00** Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэнне». Фільм 10, «Аптэчная картэль». 2 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.20** Фільм «Хата, якую пабудаваў Свіфт». 1983 г. 1-я серыя.
**17.00** «Гарадок». Дайджэст.
**17.25** Прэм'ера. «Жыў-быў вясёлы чалавек. Аркадзь Хайт». Дакументальны фільм.
**18.25** «Сумленны дэтэктыў».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Адмысловы карэспандэнт».
**20.30** Фільм «Хата, мілая хата». 2007 г.
**22.30** Фільм «Блюз ападаючага лісця».

---

НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**10.55** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.30** «Авіятары».
**12.00** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Крамлёўскія пахаванні. Якаў Свярдлоў».
**14.10** Прыгодніцкі фільм «Мільён гадоў да нашай эры».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Дужанне за ўласнасць».
**17.00** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак: Аддзел аператыўных расследаванняў».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**19.50** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**20.55** «Галоўны герой».
**22.05** Крымінальна-авантурны фільм «Выкрадальнікі».
**23.55** Трылер «Прыхільнік».

---

EUROSPORT

**04.00** Суперспорт. Чэмпіянат свету ў Аўстраліі. Прамая трансляцыя.
**06.30** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Аўстраліі. Заезд 2-і. Прамая трансляцыя.
**09.30** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы ў Расіі (Уфа). Жанчыны. Гонка праследу.
**10.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Славеніі (Краньска Горка). Мужчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**11.00** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы ў Расіі (Уфа). Мужчыны. Гонка праследу. Прамая трансляцыя.
**11.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Балгарыі (Банско). Жанчыны. Супергігант. Прамая трансляцыя.
**13.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Славеніі (Краньска Горка). Мужчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**14.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Мужчыны. 50 км вольным стылем. Мас-старт. Прамая трансляцыя.
**16.30** Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.
**17.00** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы ў Расіі (Уфа). Жанчыны. Гонка праследу.
**17.30** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы ў Расіі (Уфа). Мужчыны. Гонка праследу.
**18.00** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Аўстраліі. Заезд 1-ы.
**18.30** Суперспорт. Чэмпіянат свету ў Аўстраліі.
**19.00** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Аўстраліі. Заезд 2-і.
**19.45** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Мужчыны. 50 км вольным стылем. Мас-старт.
**20.30** Тэніс. Турнір АТР у ЗША. Фінал. Прамая трансляцыя.
**22.30** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBA у Швейцарыі (Цюрых).
**00.15** Матаспорт па выходных.
**00.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Ліберац). Мужчыны. 50 км вольным стылем. Мас-старт.
**01.30** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы ў Расіі (Уфа). Жанчыны. Гонка праследу.
**02.00** Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.

---

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ____________ (по реестру ф. 11)
№ ____________ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|
| | | | |

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________________ руб.

____________________________________ (сумма прописью)

Кому Куда: Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________________________________

Адрес ____________________________________ (почтовый индекс и подробный адрес)

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
____________________________________ (фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня ________
Всего ________
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
____________________________________ (фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня ________
Всего ________
Кассир

ЦІКАВА

# ГІСТОРЫЯ АДНАГО ПРЫСУДУ

Іван БІЧ

**20 гадоў таму лідэр Ірану заклікаў забіць англійскага пісьменніка.**

14 лютага 1988 года ў сетку праграм «Радыё Тэгеран» давялося ўнесці змены. Эфір запатрабаваў лідэр ісламскай рэвалюцыі аятала Хамейні. Тэмай свайго выступу ён нечакана абраў кнігу «Сатанінскія вершы» брытанскага пісьменніка індыйскага паходжання Салмана Рушдзі. Кніга выйшла напярэдадні і ўжо стала да таго часу скандальнай. Шматлікія ісламскія тэолагі абвінавацілі Рушдзі ў свядомай абразе ісламскіх каштоўнасцяў. На іх думку, галоўны герой кнігі — карыкатура на прарока Мухамеда. Кніга была забароненая ў некалькіх краінах.

Аднак іранскі лідэр пайшоў далей. Ён зачытаў фатву (рашэнне, якое выносіць муфцій па нейкаму пытанню, заснаванае на прынцыпах ісламу і мусульманскай юрыдычнай практыкі). Адпаведна фатве, Салмана Рушдзі трэба было забіць. Такога павароту справы ніхто не чакаў.

Пры ўсіх сваіх недахопах Салман Рушдзі не быў фанатычным праціўнікам ісламу. Ён нарадзіўся ў Бамбеі. У 14 гадоў паехаў вучыцца ў Кембрыдж. Пазней працаваў у тэатры і як журналіст. Паспрабаваў сябе ў літаратуры. Ягоная другая кніга «Дзеці поўначы» мела вялікі поспех і вывела яго ў першую лігу брытанскіх пісьменнікаў. Па палітычных поглядах ён быў памяркоўным левым, і таму, натуральна, крытычна ставіўся да забабонаў індускіх нацыяналістаў.

Так, Рушдзі заўсёды крытыкаваў індыйскую рэпрэсіўную палітыку ў дачыненні да мусульманскай меншасці ў штаце Кашмір. Ён таксама спрачаўся з тэзісам пра тое, што нашэсце мусульман у Індыю ў XI стагоддзі быццам цалкам знішчыла індыйскую цывілізацыю.

Як пішуць крытыкі, гнеўная рэакцыя Хамейні магла быць выклікана асабістымі комплексамі. Фрагменты біяграфіі героя кнігі нагадваюць жыццёвы шлях аяталы. Мова пра перыяд, калі ён знаходзіўся на Захадзе ў палітычнай эміграцыі.



Аднак іранскі лідэр аятала Хамейні пайшоў далей. Ён зачытаў фатву, адпаведна якой, Салмана Рушдзі, аўтара «Сатанінскіх вершаў», трэба было забіць. Такога павароту справы ніхто не чакаў

Як бы тое ні было, фатва прыцягнула ўсе позіркі да Рушдзі. У Вялікабрытаніі і краінах Заходняй Еўропы, дзе на гэты час ужо склаліся эміграцкія мусульманскія камуны, прайшлі акцыі пратэсту. Эмігранты выходзілі на вуліцы і палілі кнігі пісьменніка. Аб'ектам атак сталі кніжныя крамы, якія прадавалі «Сатанінскія вершы», і офісы выдавецтваў, якія пагадзіліся іх друкаваць.

У адказ мабілізавалася прагрэсіўная грамадскасць. У некаторых краінах прайшлі акцыі ў абарону свабоды слова. Усе буйныя газеты ў прызначаны дзень выдалі першую главу «Сатанінскіх вершаў».

Заклік Хамейні паставіў у супярэчлівае становішча ўрад Вялікабрытаніі. Рушдзі заўсёды быў ідэйным апанентам кабінету Маргарэт Тэтчэр. Увогуле, на той час у пісьменніцкіх салонах Англіі лічылася шыкам крытыкаваць «жалезную лэдзі». Аднак Рушдзі з 1964 года меў брытанскі пашпарт, і прэм'ер-міністр заявіла, што дзяржава зробіць усё, каб захаваць Рушдзі жыццё. Больш за тое, 7 сакавіка 1989 года Тэгеран і Лондан з-за «Сатанінскіх вершаў» увогуле разарвалі дыпламатычныя адносіны.

На доўгія дзесяць гадоў пісьменнік аддаўся ў рукі сваіх ідэйных ворагаў — кансерватараў. Пачалася канспіратыўная частка ягонага жыцця. Хаваў яго спецыяльны аддзел паліцыі. Звычайна кватэры, дзе жыў Рушдзі, даводзілася мяняць раз на тыдзень. Пазней Рушдзі пісаў, што часам сам не ведаў, у якім горадзе жыве. Паступова ён псіхічна адаптаваўся да сітуацыі. Пагрозы, якія рэгулярна прыходзілі на яго адрас 14 лютага, у гадавіну выдання фатвы, называў «лістамі Валянціна».

Сыход Рушдзі ў падполле не азначаў, што праблема была вырашана. Найбольш радыкальныя ісламскія групоўкі вырашылі помсціць не толькі Рушдзі, але і ўсяму брытанскаму соцыуму.

3 жніўня 1989 года сябра такой групоўкі ўзарваў бомбу ў адным з гатэляў Лондану. Падчас выбуху тэрарыст загінуў, аднак яго ўчынак быў трактаваны ў Іране як подзвіг. Маці тэрарыста запрасілі на адкрыццё мемарыялу іранскім салдатам — ахвярам ірана-іракскай вайны.

Былі і такія, хто рабіў на скандале грошы. Так, у 1990 годзе група маладых брытанскіх кінематаграфістаў пакістанскага паходжання выпусціла сатырычны фільм пра Рушдзі. Па сюжэту, Рушдзі быццам збіраецца разбурыць Пакістан шляхам адкрыцця ў краіне сеткі казіно і дыскатэк. Рушдзі, які выглядае амаль як Рэмба, праследуюць агенты пакістанскіх спецслужбаў. Фільм меў адносную папулярнасць у пакістанскай камуне Вялікабрытаніі, хаця афіцыйныя ўлады адмовіліся даць яму права на пракат.

Эпапея закончылася толькі з прыходам да ўлады ў Іране рэфармісцкага ўраду. 24 верасня 1998 года ў мемарандуме аб аднаўленні дыпламатычных адносін паміж Вялікабрытаніяй і Іранам іранская камісія пагадзілася з пунктам: «Іранскі ўрад не падтрымлівае і не плануе забойства Рушдзі». Пісьменнік змог выйсці з падполля і зараз вядзе звычайнае для брытанскага пісьменніка жыццё: піша кнігі, чытае лекцыі, бярэ ўдзел у позных мерапрыемствах, нават здымаецца ў кіно. У фільме «Дзённік Брыджэт Джонс» ён згуляў самаго сябе. Нарэшце, ён стаў сэрам Рушдзі. У 2007 годзе каралева надала яму рыцарскае званне.

Тым не менш іранскія кансерватары працягваюць заяўляць, што смяротны прысуд Рушдзі застаецца ў сіле. У 2005 годзе аятала Алі Хаменеі публічна падтрымаў фатву свайго папярэдніка ў звароце да пілігрымаў, якія адпраўляліся ў Мекку. Афіцыйна Іран таксама не адмяніў фатву, спасылаючыся на тое, што па традыцыі адмяніць яе можа асоба, якая яе прыняла. Аднак, як вядома, аўтар фатвы памер у 1989 годзе.

Сам Салман Рушдзі кажа, што цяперашнія заявы фанатыкаў «хутчэй рыторыка, чым сапраўдныя пагроза». Дарэчы, маці пісьменніка, якая правяла апошнія гады свайго жыцця ў Пакістане, ніколі не адчувала дыскамфорту. Па словах Рушдзі, ісламская грамада нават аказвала ёй падтрымку.

Скандал вакол «Сатанінскіх вершаў» і фатвы, здаецца, пераходзіць у іншую сферу. Ірыян Эванс, галоўны ахоўнік Рушдзі ў часы яго канспіратыўнага жыцця, заявіў, што плануе напісаць кнігу, як Салман сапраўды сябе паводзіў. Па словах Эванса, Рушдзі намагаўся рабіць капітал на сваім статусе ахвяры экстрэмістаў. Акрамя таго, ён быў блізкі да самагубства. Сам Рушдзі заявіў, што гэта хлусня, і падаў у 2008 годзе ў суд на Эванса і выдаўца, які замовіў яму кнігу. Судовы працэс пакуль працягваецца.



Салман Рушдзі

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Зразумела, што блізкія сябры Расіі накіраваліся туды за грашыма і, трэба прызнаць, дасягнулі поспеху. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся стварыць разам з Расійскай Федэрацыяй сумесную сістэму паветранай абароны (у якасці адказу на амерыканскія праграмы ва Усходняй Еўропе) і ў адказ атрымаў крэдыт памерам 2 мільярда долараў. Гэта, так бы мовіць, палітычны кайф Расіі, за які краіна гатова плаціць, нягледзячы на ўнутраны фінансавы крызіс.

**«Грузия. Онлайн» (Грузія)**

Тое, што Беларусь знаходзіцца ў складзе расійскай геапалітычнай прасторы, выгадна Заходняй Еўропе. Выкарыстоўваючы рэсурсы Расіі, а апошнім часам і ЕС, які пашырыўся ў гэтым накірунку, рэспубліка супрацьстаіць разбураючай для еўрапейскай інтэграцыі тэндэнцыі станаўлення ва Усходняй Еўропе моцнага рэгіянальнага полюсу. У гэтым сэнсе Беларусь абараняе інтарэсы «старой Еўропы».

**«Независимая Молдова» (Малдова)**

Тым не менш беларускі флірт з еўрапейскімі суседзямі выклікае скепсіс. З 26 студзеня чыноўнікі не могуць разглядзець заяву пра рэгістрацыю праваабарончай арганізацыі «Вясна». Арганізацыя, якая займаецца наглядам за выбарамі і маніторынгам парушэнняў правоў чалавека, страціла рэгістрацыю ў 2003 годзе. «Атрымаем мы або не легальны статус, — кажа старшыня «Вясны» Алесь Бяляцкі, — гэта стане індыкатарам таго, наколькі ўрад сапраўды гатовы змяніць стаўленне да грамадзянскіх арганізацый».

**«Tageszeitung» (Германія)**

Паколькі ідзе нармальны гандаль «вы — нам, мы — вам», не пра якую змову з Крамлём, якая прадугледжвае здачу суверэнітэту, мовы быць не можа, — зрабіў выснову прэзідэнт Беларусі. У прыватнасці, па яго словах, «мова пакуль не ідзе пра замену нашага рубля на расійскі». «Беларускаму прэзідэнту выпадковых пытанняў не задаюць, быў штучна пастаўлены і гэты», — растлумачыла наша крыніца, якая добра ведае асаблівасці беларускага пратаколу. Ёсць думка, што Лукашэнка хацеў апраўдацца перад электаратам, які быў трохі перапужаны заявамі расійскага пасла наконт таго, што беларусы будуць прымаць удзел у вайсковых аперацыях за мяжой у свеце вайсковых дамоў».

**«Независимая Газета» (Расея)**

Такім чынам, атрымліваецца, што крызіс дапамог Расіі перакanаць саюзнікаў пачаць рэзкія рэформы ў рамках АДКБ з выразна антызаходнім адценнем. Іх проста купілі. З Беларуссю ўсё канчаткова зразумела: пра расійскія інтарэсы пры выдачы крэдыту гаворыцца прамым тэкстам: перадача «Газпраму» пакета акцый «Белтрансгазу» і прызнанне незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Іншымі словамі, у абмен на крэдыт — актывы і падтрымка непапулярных знешнепалітычных рашэнняў.

**«Зеркало» (Азербайджан)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ



### РАСІЯ: КРОЎНАЯ ПОМСТА – НЕ ДЛЯ ІНГУША

Прэзідэнт Інгушэціі Юнус-Бек Евкураў правёў у сталіцы краю Магасе незвычайную сустрэчу. На яе былі запрошаныя прадстаўнікі сем'яў, які знаходзяцца ў стане кроўнай помсты. Традыцыя патрабуе, каб родныя помсцілі за забойства свайго сямейніка. Пры гэтым адказнымі за забойства лічыцца не толькі сам забойца, аднак і яго блізкія, і нават дальнія родзічы. Па статыстцы МУС, сёння 180 інгушскіх сямей помсцяць адна адной. За апошнія гады ахвярамі стала каля 100 чалавек. Справа зайшла так далёка, што пра пачатак кроўнай помсты сталі агалошваць публічна, праз прэсу. Падчас сустрэчы з «кроўнікамі» прэзідэнт заклікаў іх да прымірэння. Тым больш, па яго словах, для гэтага ёсць падстава. Зараз рэспубліка збіраецца адзначыць гадавіну трагедыі — у лютым спаўняецца 65 гадоў з часу дэпартацыі інгушскага народу. Зварот прэзідэнта меў вынікі. Так, папросту на сустрэчы прымірыліся дзве сям'і, якія былі ворагамі з 1970 года.

**Паводле «Независимой газеты» (Расія)**

### ІРАК: КАНЕЦ ДЭБААСІЗАЦЫІ



У Іраку абвешчана пра прыпыненне пераследу сяброў партыі Баас (дзяржаўная партыя ў часы дыктатуры Садама Хусейна). Кампанія дэбаасізацыі стартавала адразу пасля перамогі ЗША і іх саюзнікаў над войскамі Садама. Яе сутнасць заключалася ў тым, каб разбурыць партыйныя структуры Баас, пакараць галоўных функцыянераў, узяць пад кантроль нізавыя кадры. Сябры партыі таксама былі абмежаваныя ў грамадзянскіх правах. Хаця пад рэпрэсіі трапілі толькі самыя адказныя апаратчыкі і тыя, хто пасля падзення рэжыму сышоў у партызанку, кампанія выклікала паніку сярод простых сяброў Баас. Шмат хто з іх эміграваў. Аднак цяпер яны могуць спакойна вяртацца на радзіму. На думку новых уладаў краіны, пагрозы з боку Баас больш няма. Пра гэта афіцыйна заявіў старшыня камісіі па дэбаасізацыі Ахмад Чалабі. Ён таксама падкрэсліў, што дэбаасізацыя была абавязковым этапам на шляху станаўлення нацыянальнага адзінства іракцаў.

**Паводле «Le Figaro» (Францыя)**

### ПОЛЬШЧА: ПАПУ РЫМСКАГА ХАЦЕЛІ ЗАБІЦЬ У 1987 ГОДЗЕ



Польская прэса цытуе варшаўскага святара Здзіслава Кроля. Ён сцвярджае, што ў 1987 годзе на Папу Яна Паўла II, які быў з візітам на радзіме, рыхтаваўся тэрарыстычны замах. Яго арганізатарам быў грамадзянін Балгарыі, які працаваў у адным з варшаўскіх гатэляў. План заключаўся ў тым, каб застрэліць Папу падчас яго праезду вуліцамі горада Чэнстахоў, дзе Папа збіраўся правесці набажэнства. Тэрарыст планаваў зняць пакой з відам на вуліцу, па якой будзе ехаць Папа, і адтуль весці па яму агонь. План быў правалены абсалютна выпадкова. Каханка балгарына прыйшла да Кроля і распавяла яму пра тое, што задумаў яе хлопец. Кроль успрыняў інфармацыю дастаткова сур'ёзна, памятаючы пра замах на Папу ў 1981 годзе. Яго здзейсніў турак, які быццам быў звязаны з балгарскай разведкай. Святар адразу інфармаваў паліцыю, якая арыштавала балгарына. Што было з ім далей, Кроль не ведае. Супрацоўнікі архіваў Службы бяспекі (польскі аналаг савецкага КДБ) тым часам сцвярджаюць, што ніякай інфармацыі пра замах у іх няма. Таму, на іх думку, магчыма, мела месца правакацыя спецслужбаў з нейкай пакуль што невядомай мэтай. Дарэчы, за часы пантыфікату Яна Паўла II на яго жыццё было зроблена 15 замахаў.

**Паводле «Der Welt» (Германія)**

СКАНДАЛ

# КОД ПАПЫ

**Алег ПЯТРОЎ**

**Рашэння Папы Рымскага рэабілітаваць былога святара, які адмаўляе факт Халакосту, справакавала не толькі гучны скандал, але і прымусіла шмат каго задацца пытаннем: «Хто такі Бенедыкт XVI?»**



«Халакост быў злачынствам супраць Бога і чалавецтва», — сказаў Папа Рымскі. Заява была зроблена 12 лютага падчас сустрэчы главы каталікоў з дэлегацыяй амерыканскіх яўрэяў пад кіраўніцтвам галоўнага рабіна Нью-Йорку. Лідэр каталіцкай царквы таксама паведаміў пра намер наведаць Ізраіль.

Такім чынам, фармальна крызіс, які на працягу двух тыдняў псаваў дыялог паміж Ватыканам і яўрэямі і нават выклікаў нешта падобнае на раскол у шэрагах саміх каталікоў, быў вырашаны.

Скандал пачаўся 21 студзеня, калі Ватыкан зняў з чатырох святароў экскамуніку. Экскамуніка — забарона святарам служыць у Касцёле. Усе чацвёра — сябры Братэрства святога Пія — была пакараныя ў 1988 годзе.

Калі трое з іх мала вядомыя асобы, то чацвёрты — Рычард Вільсан — абсалютна скандальная фігура. Ён нарадзіўся ў 1940 годзе і вырас у добрай лонданскай сям'і. У 1968 годзе ў разгар моладзевай сексуальнай рэвалюцыі ён насуперак настроям сваіх равеснікаў стаў пратэстанцкім святаром. Пазней перайшоў у каталіцтва і далучыўся да Братэрства святога Пія. Гэта братэрства лічыцца самай кансерватыўнай групоўкай унутры Касцёла. Ягоныя сябры актыўна дапамагалі рэжыму Вішы (прафашысцкі марыянетачны рэжым, створаны ў Францыі ў 1940–1944 гадах).

Аднак нават сярод сяброў братэрства Вільсан вылучаўся занадта радыкальнымі поглядамі. Напрыклад, ён адкрыта заяўляў, што любы Папа Рымскі, што быў абраны пасля Другога ватыканскага сабору, ёсць нелегітымным (на Другім ватыканскім саборы (1962–1965) была прынятая дэкларацыя «Nostra Aetate», якая, сярод іншага, асуджае антысемітызм і прадугледжвае кааперацыю каталікоў з іншымі рэлігійнымі канфесіямі).

На пачатку 80-х Вільсан канчаткова заяўляе пра свае сімпатыі да тых, хто адмаўляе факт Халакосту. З таго часу мала што змянілася ў поглядах адступніка. Так, падчас апошняга візіту ў Швецыю брытанец заявіў: «У газавых камерах не загінуў ніводны яўрэй». Ён таксама любіць даказваць, што канструкцыя газавых камер у Асвенціме ніякім чынам не магла прывесці да смерці вязняў. І такі чалавек можа зноў належаць да Касцёла?

Яўрэйская арганізацыя і частка каталіцкага кліру па ўсяму свету ўсталі на вушы. Былы галоўны рабін Ізраіля, які перажыў Бухенвальд, пытаў: «Як стала магчыма, што такі чалавек, як Вільсан, атрымлівае апеку і рэабілітацыю з боку лідэраў каталіцкай царквы?» Выкладчыкі факультэту тэалогіі ў Мюнстэры прынялі калектыўную заяву пратэсту. Некаторыя каталікі нават заявілі пра намер выйсці з Касцёлу. Нават нямецкая прэса, якая ў свой час горача вітала абранне немца на пасаду главы Ватыкана, знаходзіцца ў стане разгубленасці. Больш за тое: само Братэрства святога Пія шакаванае рашэннем Ватыкана і не ведае, што рабіць.

Заява Папы ад 12 лютага быццам зняла праблему. Аднак пытанняў засталося вельмі шмат. Галоўнае — дзе логіка ў паводзінах Папы?

Вільсана амніставаў той самы Папа, які ў самым пачатку свайго пантыфікату зрабіў шэраг яскравых жэстаў (візіт у сінагогу Кёльна, наведванне Асвенціма), якія дэманстравалі яго намер працягнуць палітыку Яна Паўла II, які адкрыта асудзіў антысемітызм.

Натуральна, з'явіліся прыхільнікі версіі аб тым, што Папа — латэнтны кансерватар і рэтраград. Яны згадалі, што менавіта цяперашні Папа высунуў ідэю надання Папе Пію XII статуса «блажэнны» (не блытаць са святым). Фігура Пія XII вельмі супярэчлівая. Яго пантыфікат прыйшоўся на часы станаўлення фашызму, другой сусветнай, генацыду яўрэяў, аднак Ватыкан не заняў выразную крытычную пазіцыю да гэтых падзей.

Варта згадаць таксама неасцярожны выступ Папы з цытатай аднаго з візантыйскіх імператараў: «Пакажыце мяне, што новага прынёс у свет Магамет. Нічога, акрамя зла». Натуральна, гэта выклікала гнеў мусульман ад Дакару да Кабулу.

Выпадак з Вільсанам пачалі трактаваць больш шырока. Хейнер Гайслер, былы генсек самай правай кансерватыўнай нямецкай партыі «Хрысціянскі сацыяльны саюз», абвінаваціў Ватыкан у тым, што ён ігнаруе інтарэсы жанчын, людзей іншай веры, тых, хто з розных прычынаў вышлі са шлюбу. Ён лічыць, што Папа знаходзіцца пад ціскам кансерватыўнага лобі, якое яго атачае.

Нехта лічыць, што Папа стаў ахвярай ватыканскіх бюракратаў, якія амніставалі антысеміта на аўтамаце. Аднак адзін з кардыналаў паведаміў, што рашэнне Папа прымаў самастойна.

Не думаецца, што Папа экстрэміст. Нямецкая прэса, якая актыўна дыскутуе наконт механізму прыняцца рашэння у апараце а лічыць, што Папа проста страціў кантакт са знешнім светам. «Бенедыкт не ёсць палітыкам, не разумее настрояў мас, не можа гуляць з іміджам, жыве тэалагічнымі догмамі і пунктамі статуту Касцёлу», — сцвярджае адзін з прыхільнікаў гэтай версіі.

Цяжка казаць, наколькі яна адпавядае сапраўднасці. Але адна цытата з аўтабіяграфіі Йозефа Ратцынгера сапраўды прымушае задумацца. На адной са старонак кнігі ён крытыкуе вынікі ўжо згаданага вышэй Другога ватыканскага сабору за тое, што ён перагледзеў правілы правядзення імшы. «Я перакананы, што крызіс Касцёла, які мы цяпер перажываем, вынікае ў вялікай ступені з упадку літургіі», — пісаў будучы Папа.

РЭФЕРЭНДУМ

# НАРОДНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

Алег НОВІКАЎ

**15 лютага на рэферэндуме грамадзяне Венесуэлы падтрымалі шэраг паправак у канстытуцыю, што былі вынесены на грамадскае абмеркаванне прэзідэнтам Уга Чавесам. Прапануем агляд вынікаў галасавання на старонках міжнароднай прэсы.**



**Даведка:**

У 1999 годзе з ініцыятывы Уга Чавеса ў краіне была прынятае так званая Баліварская канстытуцыя. Яна перадала ў рукі прэзідэнта больш паўнамоцтваў. Дзяржава атрымала магчымасць у большай ступені кантраляваць эканоміку. Аднак прэзідэнцкі тэрмін у канстытуцыі быў абмежаваны дзвюма кадэнцыямі. У 2007 годзе Чавес упершыню паспрабаваў змяніць гэты параграф, але беспаспяхова: 51 працэнт выбаршчыкаў галасаваў супраць пакету прапанаваных прэзідэнтам паправак. Праз год Чавес абвясціў новы рэферэндум. На гэты раз прапанова была падтрыманая 54 працэнтамі выбаршчыкаў. У ноч на панядзелак шчаслівы Чавес абвясціў пра новы этап баліварскай рэвалюцыі.

Левая, асабліва посткамуністычная прэса, каментуе вынікі плебісцыту амаль у эйфарыі. «Так — рэвалюцыі!» — пад такім калонтытулам выйшла блізкай да нямецкай Левай партыі выданне «Junge Welt». Перамога Чавеса параўноўваецца з сапраўднай народнай рэвалюцыі.

На жаль, па-за ўвагай такіх каментараў застаецца, напрыклад, колькасная розніца паміж тымі, хто галасаваў «Si» (ісп: «за») і тымі, хто сказаў «No». Сапраўды, перамогу Чавеса цяжка назваць усенароднай: 6 мільёнаў падтрымалі Чавеса, прыкладна пяць — адмовілі яму ў жаданні быць пажыццёвым прэзідэнтам.

Правыя і левацэнтрысцкія выданні дружна крытыкуюць Чавеса. На іх думку, венесуэльскі рэферэндум — гэта спроба адаптаваць дзяржаўныя інстытуты да інтарэсаў і патрэбаў адной асобы.

Іспанская «El Pais» піша: «Нельга вітаць канстытуцыйную рэформу, сэнс якой дазволіць канкрэтнаму палітыку як мага больш заставацца ва ўладзе. Нават у дэмакратычных краінах супольнасць часта не мае імунітэту супраць ціску дзяржавы. У Венесуэлы, дзе дзяржаўныя інстытуты фіктыўныя, а ўсе эканамічныя рэсурсы сканцэнтраваны ў руках дзяржавы, гэты феномен куды больш маштабны. Атрымаўшы горкі ўрок год таму, Чавес на гэты раз сканцэнтраваў усе адміністратыўныя рычагі, каб давесці справу да перамогі».

Тая ж газета «El Pais» прызнае некаторыя поспехі апазіцыянераў: «Праціўнікі Чавеса сабралі на мільён галасоў больш, чым у снежні 2008 года, калі ў краіне прайшлі рэгіянальныя выбары. Таксама апазіцыя кажа, што ўпершыню за дзесяць гадоў праўлення Чавеса краіна падзеленая ў прапорцыі 55 працэнтаў насельніцтва за Чавеса і 45 супраць. Раней расклад быў 60 на 40».

Гэтыя лічбы дазволілі іншай іспанскай, блізкай да кансерватараў, газеце «ABC» заявіць: «Пытанне — адзін мільён». На думку выдання, ёсць відавочна пазітыўная тэндэнцыя, і перамога апазіцыі не за гарамі.

Аднак не ўсе такія аптымісты. Тая ж «El Pais» лічыць, што апазіцыя не здолела развіць поспех, калі ў 2007-м перамагла на рэферэндуме. З іншага боку, выданне прызнае патэнцыял студэнцкага апазіцыйнага руху, які «не маючы ніякага вопыту і рэсурсаў, стаў авангардам кампаніі». Газета піша, што зараз шмат што будзе залежаць ад таго, ці здолее моладзь не расчаравацца і застацца ў палітыцы.

Аргенцінская «Nation», у сваю чаргу, звяртае ўвагу на тое, што апазіцыя не здолела разбурыць электаральную базу Чавеса — бедныя раёны, дзе ўрад актыўна будуе інфраструктуру (школы, шпіталі, танныя крамы). Газета піша пра тое, што колькасць тых, хто пачаў хадзіць на выбары, у гэтых раёнах за 10 гадоў вырасла ўдвая. Іх сімпатыі відавочныя.

Нямецкая «Tageszeitung» пагаджаецца з гэтай думкай. «Мільёны венесуэльцаў апошнім часам адчулі пазітыўныя змены ў сваім жыцці. Больш-менш нармальна сталі працаваць медыцынскія ўстановы, чысцей стала вада для піцця, з'явіліся рэальныя шансы атрымаць адукацыю. Для шматлікіх венесуэльцаў гэта сапраўдная рэвалюцыя. Жудасны разрыў паміж багатымі і беднымі скарачаецца хутчэй, чым у суседніх краінах, і гэта, безумоўна, заслуга Чавеса».

Мексіканская «Jornada» цытуе аднаго з лідэраў апазіцыі Тодара Петкава: «Апазіцыі трэба выйсці за межы антаганістычнай установкі — за або супраць Чавеса. Такі падыход не працуе ў бедных раёнах. Нам трэба формула: «Мы за апазіцыю, аднак не супраць рэформ Чавеса». Стаўка, на думку Петкава, мае быць зроблена на відавочную супярэчнасць дзяржаўнай прапаганды. З аднаго боку, рэжым на словах бачыць асновай свайго рэжыму базавыя дэмакратычныя інстытуты, з іншага — квітнее культ асобы Чавеса. Дзяржава мае страх перад ініцыятывай знізу. За час праўлення Чавеса колькасць дзяржаўных чыноўнікаў вырасла ўдвая.

Аднак нават тыя журналісты заходняй прэсы, якія прызнаюць лагічнасць перамогі Чавеса, кажуць, што будучыня яго рэжыму вельмі туманная.

Тая ж «Tageszeitung» сцвярджае: «Чавесу пашчасціла: ён паспеў правесці рэферэндум да глабальнага эканамічнага крызісу і падзення коштаў на нафту. Усе поспехі сацыяльнай палітыкі Чавеса прыйшліся на часы, калі экспарт нафты прыносіў каласальныя даходы. У 2007 годзе краіна вырабляла штодня 2,6 мільёна барэлей нафты і прадавала іх па 140 долараў за барэль, што прыносіла 77 мільярдаў долараў штогод. Нядзіўна, што палова бюджэту фінансуецца за кошт экспарту нафты. З тых часоў, як кошты на нафту пачалі падаць, у бюджэце з'явіліся першыя дзіркі. Увосень Чавес спрабаваў заспакоіць суайчыннікаў. «Пакуль барэль каштуе больш за 55 долараў, Венесуэле нічога не пагражае, — аптымістычна заявіў ён. Аднак цяпер барэль каштуе 37 долараў. Акрамя таго, краіна залежыць ад імпарту прадуктаў, на якія штогод ідзе 5 мільярдаў долараў».

Рэзюме артыкула — пытанне: «Ці хопіць 80 мільярдаў дзяржаўнага рэзерву, каб працягваць сацыяльныя праграмы да 1012 года, калі адбудуцца наступныя выбары прэзідэнта?» У любым выпадку, рост эканамічнай вытворчасці ўжо скарачаецца. У мінулым годзе рост венесуэльскай гаспадаркі ўпаў з 8 працэнтаў да 4,8 працэнта.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### АБДЭЛЬАЗІС БУТЭФЛІКА



Прэзідэнт Алжыра, які лічыцца аўтарытарным палітыкам, ужо двойчы абіраўся прэзідэнтам, і 7 красавіка збіраецца атрымаць мандат у трэці раз (хоць пра тое, што выбары прэзідэнта будуць нагадваць фарс, ведаюць у Алжыры ўсе). Аднак на гэты раз на шляху рэалізацыі плану ў прэзідэнта ўзніклі перашкоды. Галоўная апазіцыйная партыя нечакана заявіла, што будзе байкатаваць мерапрыемства. Мова пра «Фронт сацыялістычных сілаў» (FFS), самую старую партыю апазіцыі, заснаваную яшчэ ў 1963 годзе. Карым Табу, старшыня FFS, заявіў: «Байкот у цяперашніх умовах — гэта форма праяўлення любові да сваёй радзімы». FFS стала апошняй буйной палітычнай структурай краіны, якая падтрымала ідэю байкоту. Раней падобнае рашэнне прынялі іншыя ўплывовыя партыі апазіцыі — «Асамблея за культуру і дэмакратыю» (RCD) і партыя ісламістаў. Цяпер усе чакаюць рэакцыі ўладаў. Пойдуць яны на дэмакратызацыю выбарчага працэсу або рэжым рызыкне праводзіць выбары з адным кандыдатам? Шмат што можа залежаць ад пазіцыі Парыжу — галоўнага эканамічнага партнёра Алжыру. Праўда, у студзені Нікаля Сарказі заявіў, што «ўрад Бутэфліка неабходна падтрымліваць, паколькі ніхто не жадае з'яўлення ўраду талібаў у Алжыры».

### БАЛТАЗАР ГАРСОН



Калі называюць імя генеральнага пракурора Іспаніі, першае, што прыходзіць на памяць, пераслед баскскіх сепаратыстаў. Менавіта з падачы пракурора былі забаронены ўсе палітычныя партыі прыхільнікаў незалежнасці Краіны Баскаў. Аднак у зоне ўвагі пракурора знаходзяцца не толькі сепаратысты, але і імперыялісты, якіх у Іспаніі ўвасабляе кансерватыўная «Народная партыя» (PP). Балтазар пачаў аперацыю «Пояс», мэта якой — высветліць крыніцы даходу прадпрымальніка Францыска Карэа, аднаго з галоўных партнёраў народнікаў на працягу апошніх 20 гадоў. Звычайна партыя, якая па іспанскіх законах дзейнічае за грошы дзяржавы, замаўляла яму праводзіць розныя партыйныя мерапрыемствы. Па версіі пракурора, частка тых грошай сыходзіла ў кішэні кіраўніцтва PP. Пад следствам ужо аказалася 37 парламентарыяў. Пакуль Карэа дае паказанні, лідэры PP спяшаюцца пазбавіцца ад патэнцыйных фігурантаў афёры. У добраахвотную адстаўку сышлі некалькі мэраў — сяброў PP. У скандалу ёсць важны аспект: ён выбухнуў за тры тыдні да выбараў у рэгіянальныя парламенты Галісіі і Краіны Баскаў, што можа адбіцца на выніках галасавання. Гэта супадзенне дало падставу кансерватарам заявіць, нібыта сацыялісты, якія знаходзяцца пры ўладзе, замовілі аперацыю «Пояс».

### ПРАМОД МУТАЛІК



Імя індуісцкага фундаменталіста, заснавальніка групы «Sri Ram Sena» («Войска бога Рамы»), нечакана згадалі самыя вядомыя СМІ свету. Прычына — экзатычная ініцыятыва рэлігійнага фанатыка. Напярэдадні Дня святога Валянціна Муталік заявіў, што ягоныя паслядоўнікі арганізуюць рэйд па барах і кафэ краіны ў пошуках тых, хто святкуе гэтае глыбока варожае індуісцкай веры свята «заходніх геданістаў». Хаця парушальнікам рэлігійных канонаў Муталік пагражаў толькі прымусовай лекцыяй пра асновы індуізму, усе чакалі актаў гвалту. У студзені сябры «Войска бога Рамы» правялі зачыстку бараў у пошуках жанчын, якія наведвалі падобныя ўстановы. Вайна за рэлігію вылілася ў банальнае збіццё наведвальніц кафэ. 14 лютага ў індыйскіх гарадах, дзе «Sri Ram Sena» дзейнічае найбольш актыўна, паліцыя ўзяла пад ахову бары, аднак да сур'ёзных сутыкненняў справа не дайшла. Застаецца дадаць, што выхадкі «індыйскіх талібаў» (так называюць групу Муталіка ў прэсе) самі індуісцкія кансерватары часта называюць вельмі правакацыйнымі і кампраметуючымі іх рух. Так, у снежні 2008 года фундаменталісты сарвалі паказ жаночай моды на падставе таго, што за дэфіле індыйскіх жанчын могуць назіраць заклятыя ворагі індусаў — мусульманскія мужчыны.

▸ КІРМАШ

# МІНСК ВАРТЫ BUCHMESSE

## УВОДЗІНЫ Ў ПАРАЎНАЛЬНУЮ БУКІНІСТЫКУ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Паводле беларускіх інфармацыйных агенцтваў, 11–15 лютага ў Мінск зноў прыехала Кніга. У Нацыянальным выставачным цэнтры БелЭКСПА адбылася XVI Міжнародная кніжная выстава-кірмаш «Кніга Беларусі–2009». Але, паводле адчуванняў шараговага чытача, Кніга ў Беларусь так і не даехала. І толькі самыя спрытныя бібліяфілы былі ў курсе: Кніга пераехала Беларусь. Вашай увазе прапануюцца нататкі чытачкі, якая пабывала не толькі на кніжнымі кірмашы ў Мінску, але і на Балтыйскім кніжным кірмашы–2009, які адбываўся паралельна з мінскім — 12–15 лютага ў віленскім LITEXPO.**




Фота аўтара

Шараговыя наведнікі Мінскага і ўдзельнікі Віленскага кірмашу Андрэй Хадановіч і Уладзімір Арлоў на фоне стэнду «Друкаваныя выданні Рэспублікі Беларусь» (Вільня, LITEXPO)

### «Планетарный миф»

Кірмаш — гэта свята. Так павялося здавён. У Менску — дык прыкладна з 1499 года, калі паводле Магдэбургскага права горад атрымаў прывілей ладзіць кірмашы. Кніжны кірмаш — гэта, адпаведна, свята кнігі. Першыя кніжныя кірмашы пачалі ладзіцца ў нямецкім Франкфурцена-Майне яшчэ ў XVI стагоддзі — акурат тады, калі ў Еўропе засвоілі тэхнічныя вынаходніцтвы Гутэнберга ды Скарыны. Франкфурцкі кніжны кірмаш і сёння лічыцца найбуйнейшым у свеце. Пачынаючы з 1990-х кніжныя кірмашы — добрая традыцыя фактычна ўсіх еўрапейскіх краін, дзе назіраецца хоць якое кнігавыдавецтва. У тым ліку і Беларусь ужо каторы раз не праходзіць міма еўрапейскіх традыцый духоўна-матэрыяльнай культуры. Выставачны цэнтр «БелЭКСПА», які сімвалічна размясціўся наўпобліз скрыжавання мінскіх вуліц Янкі Купалы і Максіма Багдановіча, зноў разнасцежыў дзверы насустрач ахвочым складваць у словы літары.

Але, як ні спрабавала я перад паходам «у кнігі» настроіць сябе пазітыўна, адчування свята пасля наведвання мінскага кірмашу ў мяне так і не з'явілася. Наадварот — вынесла з «парніка» былога ВДНХ адчуванне лёгкай дэпрэсіі. Якая, з аднаго боку, вылекавалася, а з іншага — толькі павялічылася з паездкай на адпаведны кірмаш у Вільні. На памяць прыходзілі і мае штовераснёўскія вяжы на Форум выдаўцоў у Львове і чытаныя агляды «Фракфуртэр бухмесэ–2008». Ой, правільна той казаў: меней ведаеш — лепей спіш.

### «Лезвие осознания»

Кірмаш — гэта абмен. Таварамі, досведам, пазітывам. Міжнародны кірмаш — гэта абмен усім пералічаным паміж прадстаўнікамі розных народаў. Ведаючы гэта, арганізатары мінскага кніжнага кірмашу запрасілі да ўдзелу кнігавыдавецтвы з 25 краінаў. Ганаровай госцяй выставы «Кнігі Беларусі–2009» стала Рэспубліка Казахстан.

Рытуальныя дзеянні па ўшанаванні ганаровай госці адбыліся падчас закрыцця і адкрыцця выставаў. Рэшту часу пужаная і стомленая казахская дзяўчына самотна ахоўвала чатыры метры айчыннага стэнду і ў адказ на ўсе пытанні прасоўвала наведнікам прайс-ліст выдавецтва «Алматыкітап баспасы», дзе ўсе кошты былі пазначаныя ў тэнгэ. Стэнды ЗША, Нямеччыны, Швецыі, Паўднёвай Карэі, Венесуэлы, Арменіі ды іншых краін, большасць з якіх былі постсавецкія ці сацыялістычныя, стваралі трывалае ўражанне зусім не прафесійнага абмену, а жэсту добрай волі з боку пасольстваў пэўных дзяржаў.

Кнігі размяркоўваліся па стэндах не па камерцыйным прынцыпе (хто выдаў, той і прадае) — а па ідэйна-тэматычным, таму кнігі Уладзіміра Арлова можна было пабачыць на стэндах Польшчы і Славеніі, а шведы прэзентавалі свае галоўныя дасягненні ў галіне сяброўства з Беларуссю: «Карлсана-з-Даху» і «Піпі Даўгуюпанчоху». Мелі поўнае права, вядома ж — але даверу да прафесійнасці мерапрыемства гэта не дадавала. Большасць з выстаўленых кніг памацаць так і не давялося.

Усё, прывезенае дэлегацыямі, экспанавалася ў дэма-рэжыме, напрыканцы кнігі пампезна перадаваліся ў падарунак бібліятэкам і універсітэтам — а некаторыя стэнды «разгрузілі» ў самы разгар падзеяў. Некалькі атласаў, крыху шыкоўна выдадзеных дзіцячых кніжак, пара-тройка тамоў класікі роднай літаратуры, слоўнікі — вось стандартны асартымент замежнага прадстаўніцтва. Маё пытанне на стэндзе Украіны, чаму ўкраінскіх выдаўцоў не цікавіць Беларусь, мела кароткі адказ: «Дорага». Прывозіць да нас кнігі нерэнтабельна — бо «крызіс», на які апошнім часам самыя розныя прадпрымальнікі вешаюць усё, як мафіёзі на мёртвага падзельніка. Насамрэч жа мінчукам не пашанцавала па іншай прычыне — прэзентабельны стэнд Форуму выдаўцоў у Львове, які актыўна рэкламаваў сябе ў суседзяў, сёлета стаяў у Вільні...

### «Спецназ России»

Кірмаш — гэта сустрэчы. Кніжны кірмаш — гэта сустрэчы з кнігай і тымі, хто іх піша. У праграме было заяўлена 120 мерапрыемстваў, але збольшага гэта былі вузкапрафесійныя прэзентацыі. Як ні мусіруецца ў СМІ статыстыка, паводле якой у сённяшняй Беларусі практычна не чытаюць мастацкай літаратуры, натоўпы перад стэндамі сігналізавалі: галоўную ўвагу прыцягвалі зусім не падручнікі, слоўнікі ды ілюстраваныя энцыклапедыі па краіназнаўстве, а менавіта творы літаратараў і іх выступы. Так, літаратары прыходзілі і выступалі. Але такіх акцый было катастрафічна мала! Стыхійныя аўтограф-сесіі: «Я тут, я аўтар, вы купіце маю кнігу, а я вам падпішу!» — на маю думку, у лік культурных мерапрыемстваў уключаць не выпадае.

Найбуйнейшым на кірмашы «Кнігі Беларусі–2009» было, зразумела, прадстаўніцтва Расійскай Федэрацыі — пад гэтай шыльдай сталыя наведнікі мінскіх кнігарняў і развалаў маглі ў чарговы раз пабачыць расійскія «навінкі», якія гарталі цягам усяго мінулага года. Да таго ж, далёка не ўсе «навінкі». Але было і адваротнае.

Прыемна ўразілі стэнды выдавецтваў РГГУ (Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага універсітэта), чые выданні па філалогіі і культуралогіі сапраўды сталіся унікальным шанцам для спецыялістаў папоўніць хатнюю бібліятэку — і «Время», якое прывезла збор твораў Васіля Быкава на беларускай мове і перавыданне папулярных кніг Святланы Алексіевіч. У астатнім... Падзагалоўкі для гэтага агляду — узятыя мной жыўцом назвы некаторых адзінак расійскай кніжнай прадукцыі, якія, па словах прадаўцоў, на мінскім кірмашы карысталіся «шалёнай папулярнасцю».

Для параўнання. На мінскім і віленскім кірмашы сёлета можна было пагартаць шыкоўныя альбомы любімага і паважанага мной нямецкага выдавецтва «Taschen», якое спецыялізуецца на выданнях па сучасным мастацтве ў самым шырокім разуменні слова: фатаграфія, медыі, кіно, арт-рэклама... Але некалькі не надта новых "ташэнаўскіх" альбомаў у Мінску былі адно выставачнымі асобнікамі. У Вільні ж выдавецтва «Taschen» мела асобны стэнд, дзе аматары мастацтва мелі магчымасць набыць ці замовіць апошнія навінкі аднаго з флагманаў еўрапейскай візуальнай кнігі. Мінчукі, якія праявілі цікавасць да «Taschen», ласкава запрашаліся ў бібліятэку Гётэ-інстытута. Ці ў кнігарні Берліна.

### «Исконный триглав»

Кірмаш — гэта атракцыёны. Пра гэта выдатна ведаюць удзельнікі любых іншых прафесійных выставаў. Стэнды замаўляюць прафесійным дызайнерам, супрацоўнікі падыходзяць да іх афармлення з душой і выдумкай, ствараючы камфортную атмасферу для калег і наведнікаў, прыдумваючы перформансы, гульні, смешныя рэкламныя акцыі. І калі на Львоўскім форуме выдаўцоў, традыцыйна бітма забітым кнігамі, творчай думцы проста няма дзе разгарнуцца — сотні літаратурных акцый размяркоўваецца па ўсім горадзе, то віленскі павільён LITEXPO прадстаўляе вельмі шырокія плошчы сваім удзельнікам.

14 лютага на адным стэндзе дзіцячай літаратуры малеча размалёўвала расфарбоўкі і стварала сваю кнігу, на другім — падлеткі ўпрыгожвалі стойку рознакаляровымі «валянцінкамі», на стэндзе японскай літаратуры складвалі журавікаў... Жывыя кветкі на сталах сярод кніг былі чымсьці, што само сабой меркавалася. Ні на хвіліну не пуставалі канферэнц-холы, дзе нон-стоп адбываліся літаратурныя выступы і прэзентацыі аўтараў Літвы і запрошаных гасцей замежжа.

Густоўным і разнастайным быў і сам падыход да экспанавання кніг. Да паліц можна было

## ПА АБОДВА БАКІ ПРЫЛАЎКА

### «Гэта нармальная выстава»

**Спадар Уладзіслаў Сімяонаў,** выдавец, дырэктар Міжнароднага кніжнага кірмашу ў Сафіі, дзяжурны па стэндзе «Кніга Балгарыі» ў БелЭКСПА, так адгукнуўся пра беларускі кірмаш:

— Я па сабе ведаю, якая гэта пякельная праца — арганізаваць мерапрыемства падобнага ўзроўню. Гэта — нармальная выстава. Нас, балгар, вельмі зычліва сустрэлі ў Мінску. Адбываецца супраца, адбываюцца знаёмствы. Кніг мы, на жаль, не прадаем, але многія чытачы выказалі шчырую цікавасць да дзіцячай, шыкоўна ілюстраванай кнігі «Калі дзядуля Бог па зямлі хадзіў» — дарэчы, другі прыз кірмашу ў Сафіі. Пасля заканчэння выставы мы падорым усе прывезеныя выданні Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і Белдзяржуніверсітэту.

### «Бракавала жывых аўтараў»

**Мінчук Сяргей Казлоў** — малады спецыяліст па ўзросце і праграміст па спецыяльнасці. Каму, як не яму, быць спажыўцом тых самых тэхнічных даведнікаў, попыт на якія зашкальвае ў беларускіх кнігарнях? Але ў яго асобе я пабачыла аматара мастацкай сучаснай прозы. Ён прачытвае каля 50 кніжак у год. Я пагутарыла з ім, калі падчас абедзеннага перапынку выправіўся на кірмаш за чарговай «спажывай»:

***— Якія кнігі ты набыў на кірмашы?***

— Ніякіх. Ні выбар, ні цэны не адрозніваюцца ад выбару і цэн, што прапануюць прадаўцы пастаяннага павільёна БелЭКСПА «Мир книг». Але зацікавілі перавыданні Святланы Алексіевіч, планую вярнуцца па іх на выхадных.

***— Якія кнігі ты шукаў і не знайшоў на стэндах?***

— Шукаў «Аномалию Камлаева» Сяргея Самсонава, якую піярыў маскоўскі часопіс «Афиша».

***— Якое ўражанне зрабіла на цябе выстава?***

— Адмоўнае: стэнды са сшыткамі, ручнікамі, калькулятарамі — зусім не тое, што збіраешся пабачыць на МІЖНАРОДНЫМ кірмашы. Расчаравала Украіна. Спадзяваўся пабачыць сучукрліт. Украінскі стэнд без Андруховіча і Жадана — гэта не ўкраінскі стэнд.

***— А што б ты хацеў пабачыць на міжнародным кірмашы?***

— Паболей аўтараў. У сэнсе, жывых асоб, каб можна было задаць пытанні, падпісаць кніжку. І хаця б пару аўтараў з суседніх краін.

***— Але выступаў народны пісьменнік Казахстана...***

— Народны пісьменнік Казахстана — гэта добра, але я б хацеў пабачыць тых пісьменнікаў, якіх я магу прачытаць на мове арыгінала. Палякаў Паўла Гюле ці Анджэя Стасюка, ці ўкраінца Юрыя Андруховіча. З беларускіх бракавала выступу Андрэя Хадановіча, прэзентацыі кніг «Чалавек, які скраў сцяну плачу» і «Сцяны» Васіля Быкава з серыі «Кнігарня «Наша ніва». А гэтых кніг нават у продажы не было!

спакойна падыходзіць і гартаць — логіка супермаркету, а не вясковай крамы прамтавараў, як тое назіралася на большасці стэндаў у Мінску. Выдаўцы нібы барыкадаваліся сталамі ад наведнікаў. Самым арыгінальным па афармленні стаў стэнд выдавецтва МНС, якое адзела мужчынскі манекен у дарэвалюцыйны касцюм пажарнага. У астатнім адзіным, за што можна было зачапіцца воку ці фотаапарату, стаў сцяг Саюзу Пісьменнікаў Беларусі: як выявілася, ён вельмі нагадвае зялёны штандар Алаха.

Усё вышэйпералічанае было хаця б «у тэму». Бо некаторыя сегменты кніжнага рынку, што раскінуўся перад наведнікамі, проста дыскрэдытавалі беларускі кнігадрук як з'яву. Замілоўвалі стэнд «Белхудожпромыслы», які гандляваў ільняной вопраткай і ручнікамі, стэнд «Алтайскі мёд», які гандляваў алтайскім мёдам, і безыменны прадпрымальнік, які прадаваў ваўняныя шкарпэткі. Гэта не кажучы пра латкі з канцтаварамі, біжутэрыяй, індыйскімі пахошчамі... І снэкбар у неапетытнай блізкасці да папяровай прадукцыі. Някніжнай прадукцыяй была занятая амаль траціна экспазіцыйнай плошчы.



Фота аўтара

Мінскі кірмаш

## «Амур и Атлантида»

Кірмаш — гэта рынак. Тут заможны селянін можа апынуцца ў мінусе, а яго бедны сусед нагандляваць на сваю першую карову. Галоўнае — гнуткая сістэма платы за месца пад воз і роўнае стаўленне да ўсіх, хто прывёз жыта. Сістэма мінскага кірмашу была не рыначнай, а хутчэй каманднаадміністратыўнай.

Так, сярод удзельнікаў не было заўважана самых выбітных прыватных выдаўцоў краіны: «Логвінаў», «Галіяфы», «Лімарыюс» і шэрагу іншых. Менавіта яны выпусцілі большасць кніг, якія значыліся за 2008 год у рэйтынгу «Нашай нівы» як найлепшыя беларускія выданні года. Любому незалежнаму літаратару вядома: маючы на мэце выдаць кнігу, айчынны аўтар звяртаецца адразу да іх. Так што словы афіцыйных прэс-рэлізаў пра «сустрэчу патэнцыйных аўтараў з выдаўцамі», у дачыненні «Кніг Беларусі–2009» былі бездапаможнай калькай з канцэпцый іншых міжнародных выстаў. Такія сустрэчы на мінскім кірмашы былі малаверагодныя.

Прычыны няўдзелу прыватных прадпрымальнікаў былі заканамерныя. Ігару Логвінаву, па яго словах, проста надакучыла дачыняцца з дзяржаўным манапалістам, які то заключае з ім кантракт, то забараняе распаўсюд яго кніг праз кнігарні. Мяркую, калі б ён здарыўся на мінскай выставе як шаргаговы наведнік, наўрад ці б ён вынес з сабой жоўты шарык з надпісам «Я люблю «Белкнігу».

«Галіяф» Міхал Башура паведаміў, што на дарагую арэнду месца на кірмашы (дзень — каля 100 еўра за «латок») у яго маладога бізнесу папросту не было грошай. Прыватны выдавец Віктар Хурсік, які адважыўся на ўдзел у выставе ўсяго з парай кніжных пазіцый у прайсе, спрабаваў кампенсаваць памер арэнды проста нечалавечым коштам культавай сярод аматараў беларушчыны кнігі Сергіюша Пясэцкага «Каханак Вялікай Мядзьведзіцы» ў беларускім перакладзе. «27 тысячаў? Ды тут сабекошт не больш за восем! — прафесійна гарталі Пясэцкага тыя самыя «патэнцыйныя аўтары». — Вы што, звар'яцелі?» — «Хочаш чытаць — купляй!» — быў годны і катэгарычны адказ.

## «Перерождение»

Вось жа, «Кніга Беларусі–2009» здалося мне мерапрыемствам шмат у чым паказушным, якое, нібы тая карціна з мульціка, проста «дзірку ў сцяне закрывае». мінскі кніжны кірмаш, вонкава з'яўляючыся адпаведнікам падобных мерапрыемстваў у іншых краінах, на жаль, не выконвае асноўных функцый, якія мусіць выконваць міжнародная прафесійная выстава, і ў цэлым адлюстроўвае катастрафічнае становішча з кнігай у Беларусі. Галоўным чынам, ён дэманструе: кніга Беларусі — гэта далёка не тое ж, што беларуская кніга. Калі ж сучасныя друкары і чыноўнікі ад кнігі мараць «адпавядаць», варта істотна мадэрнізаваць як прынцыпы айчыннага кнігадруку, так і саму ідэю мінскіх «святаў кнігі».

На фоне таго, што ў Франкфурце ў 2008 годзе працэнтаў 30 прадстаўленай кніжнай прадукцыі было не на папяровых, а на мультымедыйных носьбітах, у Львове ў верасні 2008 года ў кніжных чытаннях узяло ўдзел 150 пісьменнікаў з 15 краінаў, а ў маленькай Літве, каб пазбегнуць кіламетровых чэргаў перад выставай, білеты прадавалі ў цэнтральных касах гораду, — рэч зусім не ў жывых кветках на выставачным стэндзе, хоць, «па прыколе», варта пачаць хаця б з гэтага.

### Топ–5 удзельнікаў МВК «Кнігі Беларусі–2009», паводле версіі аўтаркі

1. Выдавецтва «Про Хрысто» (Мінск, Беларусь). За прадстаўнічы стэнд, які адлюстраваў сумленную, руплівую працу ў сваёй галіне культуры і кнігадруку.
2. Выдавецтва Kolegium Europy Wschodniej (Вроцлаў, Польшча). За тое, што змаглі атрымаць візы і даехаць да Мінска нечаканым сюрпрызам. У папярэднія гады KEW актыўна выдаваў творы беларускай літаратуры як па-польску, так і білінгвальна.
3. Выдавецтва «Время» (Масква, Расія). За Васіля Быкава і Святлану Алексіевіч.
4. Прыватны выдавец Віктар Хурсік. За каханне да Вялікай Мядзведзіцы.
5. Ветэран Міхаіл Бакуменка, што экспанаваў на выставе цяжкія фаліянты па вайсковай гісторыі, якія ўласнаручна пісаў, ілюстраваў, друкаваў і пераплятаў цягам апошніх 30 год. За тое, што літаральна ўспрыняў заклік СМІ скарыстацца кніжным кірмашом як «месцам знаёмства выдаўца з аўтарам».

### Набыткі аўтаркі:

1. Аксана Спрынчан. «ЖываЯ». Мн.: «Мастацкая літаратура», 2008.
2. Часопіс «Наша вера» (Про Хрысто). №№1–4, 2008.
3. Паштоўка ИКК «Линия Сталина» са стылізаваным штэмпелем «Просмотрено военной цензурой», 4 шт.
4. Алтайскі мёд, 100 гр.

ЮБІЛЕЙ

# Віктар ШАЛКЕВІЧ: ДОБРЫЯ ТВОРЫ РОБЯЦЦА НАЗАЎСЁДЫ

Аляксей ХАДЫКА

**Днямі, адзначыўшы сваё 50-годдзе, гарадзенскі бард, актор, літаратар Віктар Шалкевіч заўважыў: «Мне неяк няёмка, што мне ўжо столькі год!» І сапраўды, як песні, так і жыццёва-сцэнічны вобраз Віктара, поўныя энергіі і гумару, успрымаюцца як увасабленне маладосці.**



Photo.ByMedia.Net

Выхаванец Беларускага тэатрально-мастацкага інстытута, ён спраўдзіўся ў жыцці не толькі працай у Гарадзенскім абласным тэатры лялек, якому застаецца верным цягам апошніх 19 год свайго жыцця. Працаваў у Гарадзенскім абласным драматычным тэатры (1980–1987), выкладаў рэжысуру і майстэрства акцёра ў культпрасветвучэльні (1987–1990).

Ён сапраўды шматаблічны — з яго песнямі сталее ўжо не першае пакаленне беларусаў, з задавальненнем разумеючы: класічны беларус зусім не абавязкова «ціхі і рахманы». Ён іранічны і разумны, лірычны і вясёлы. Самадастатковы. Як Віктар Шалкевіч у сваім штодзённым жыцці. Цяжка ўявіць лепшага вядоўцу на вечарыне, прысвечанай прэзентацыі новай кнігі. Або аўкцыяніста на мастацкім аўкцыёне. Ён выпусціў ужо шэсць альбомаў: «Правінцыя», «Смутны беларускі блюз», «Балады і рамансы», «Добрай раніцы», «За сто крокаў пекла Вострае Брамы», «Гарадзенец прызямліўся ў Менску».

Юбілейны канцэрт Шалкевіча невыпадкова сабраў 15 лютага ў сталіцы поўную залю Палаца прафсаюзаў. Гэта таксама паказчык якасці — не кожны выканаўца атрымлівае ў Мінску аншлаг і захоплены прыём інтэлектуальнай эліты. Па заканчэнні канцэрта, прыняўшы віншаванні нашай газеты з юбілеем і чарговым поспехам на сцэне, Віктар Шалкевіч адказаў на нашы пытанні.

***— Цікава, каго з літаратараў чытае слынны беларускі бард і актор, якую музыку ён слухае?***

— Зараз я чытаю такога новага аўтара, магчыма, не ўсім яшчэ добра вядомага — Валера Казакова. Піша ён па-руску, але вельмі добра разумее беларушчыну. Ёсць і пераклады на беларускую, у тым ліку зробленыя ім самім. А з музыкі слухаю класіку. Не, сур'ёзна, не сябе — Баха, апошнім часам запаў на Гендэля. Класічная музыка — для душы. З рок-музыкаў — тых, хто арыентуецца на музыку і спадчыну стылю барока. Гэта Мэцю Фішэр і іншыя.

***— Добра, а з беларускіх музыкаў — ці ёсць, на тваю думку, вартыя выканаўцы ў нашай краіне?***

— І ёсць, і былі раней. Так, напрыклад, я захапляюся ранняй творчасцю Канстанціна Герашчанкі, мне даспадобы слухаць спевы Мельнікава і Бартосіка, падабаюцца пэўныя творы Алеся Камоцкага. А ўвогуле я лічу, што музычныя густы не трэба мяняць, як спадніцу бялізну — добрыя творы робяцца назаўсёды і музыку назаўсёды заставацца, як класіка, што западае ў сэрца на ўсё жыццё. Так было ў «Чырвоных гітар», Марэка Грыхуты, у «Песняроў». «Явар з калінаю» — гэта ж шэдэўральны твор! А зараз, складаецца такое ўражанне, публіка займаецца як бы шчырымі бягамі — патрабуе хутчэй, болей — і на яе запатрабаванне героі папсовай сцэны кляпаюць шлягеры… Я да такой творчасці стаўлюся скептычна.

***— Віктар, у адным з апошніх інтэрв'ю прагучала твая сентэнцыя наконт сталіцы: маўляў, ты любіш Гародню і ў Мінск ніколі б жыць не паехаў. Чаму? У Гародні нейкая асаблівая культурная аўра?***

— Не, да Мінску я стаўлюся вельмі добра, сюды я прыязджаю працаваць. У Гародні я «сплю». А жыву там, дзе выпадае. Вось на свой дзень нараджэння быў у Вільні, а палове сёмай раніцы праходзіў пад Вострую Брамай, і — зняў шапку. Я б хацеў, каб такое адчуванне, як ля Вострай Брамы, можна было б перажываць і ў нашых гарадах. Каб вуліцы не былі залітыя нейкім свалачным асфальтам, а была брукаванка. Каб сталі чалавечыя дамкі, а не індустрыяльныя гмахі. Каб жывой была прастора культуры.

Зрэшты, жыццё складаецца з нейкіх знакавых з'яў у кожнай сферы. Скажу ў гэтай сувязі камплімент вашай газеце: «Новы час» — нармальна чытаецца, у нашай сям'і, я б сказаў, яна карыстаецца вельмі акрэсленай папулярнасцю. Пажадаў бы вам яе шырэй распаўсюджваць (зразумела, у Беларусі гэта не толькі ад вас залежыць). І прадавайце даражэй — добрае не павінна быць амаль бясплатным. Поспехаў вам!

**Сёлета сусветная грамадскасць будзе ў дзесяты раз адзначаць Міжнародны дзень роднай мовы. Нагадаем, гэты дзень быў унесены ў спіс памятных дат ЮНЕСКА ў знак павагі і пашаны да людзей, што загінулі ў 50-я гады на тэрыторыі сучаснай Бангладэш, адстойваючы правы на дзяржаўнасць сваёй роднай мовы. Фактычна, змаганне за мову прывяло народ Бангладэш да незалежнасці.**

**Заснаванне гэтай даты ў якасці Міжнароднага дня з'яўляецца сведчаннем таго, што цывілізаваны свет прызнае родную мову кожнага народа як найвялікшую культурную каштоўнасць. А значыць, ёсць разуменне і ўсведамленне таго, што трэба рабіць усё магчымае, каб моўнае аблічча нашай планеты не збяднела.**

**У нашай краіне моўнае пытанне ніяк нельга лічыць вырашаным. Абвешчанае двухмоўе на справе аказалася ўзаконеным ціскам на беларускую мову. Правa на выхаванне і навучанне беларусаў на роднай мове не падмацавана стварэннем сістэмы беларускамоўнай адукацыі як на ўзроўні школы, так і на ўзроўні сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў. Таму так важна, каб кожны грамадзянін Беларусі ведаў пра Міжнародны дзень роднай мовы, успрымаў нашу нацыянальную каштоўнасць — беларускую мову — як важную складовую частку сусветнай культуры.**

▸ **РАЗВАЖАННІ**

# КНІГІ ДЛЯ ДУШЫ

*Алена АНІСІМ, старшыня Мінскай гарадской арганізацыі ТБМ*

**Трымаю ў руках дзве кнігі: «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» і «Евангелле» на беларускай мове. Чытаю і лаўлю сябе на думцы, наколькі не хапала мне такой літаратуры на роднай мове. І як чалавеку, што не цураецца хрысціянскага вучэння, і як дыпламаванаму філолагу.**

Цяжка меркаваць, ці магла б такая літаратура на беларускай мове, з'явіўшыся ў савецкі час, істотна паўплываць на светапогляд беларуса, загнанага ў атэістычны калектыўны дом. Відаць, многае, калі не ўсё, залежала б ад тых традыцый, якія захоўваліся ў кожнай канкрэтнай сям'і. Калі бацькі і дзяды трымаліся веры, выхоўвалі маладзейшых у духу павагі да ўсяго роднага, нацыянальнага, то і кнігі духоўныя на роднай мове былі б на пачэсным месцы. Сёння ж можна радавацца хаця б такому стану рэчаў, што шчырая вера ў хрысціянскае вучэнне становіцца фактам асабістага выбару і не пераследуецца ў такой ступені, як гэта было ў нядаўнім мінулым.

Я здзіўляюся тытанічнай і скрупулёзнай працы, якую здзейсніў ксёндз Уладыслаў Завальнюк. Чытаючы «Родную мову ў духоўным жыцці Беларусі», я нібы далучаюся да самага таемнага і ўзвышальнага працэсу — да працы над Словам. Тое, як падае ксёндз Уладыслаў Завальнюк тлумачэнне слоў, як ён аргументуе свой выбар на карысць таго ці іншага тэрміна, з'яўляецца добрым прыкладам для кожнага — быць акуратным, абачлівым са словам. Такому чалавеку верыш, з такім духоўным настаўнікам спакойна і ўпэўнена будзеш крочыць па жыцці.

Мне, выхаванай у сям'і вясковых настаўнікаў на прыкладах кніжных герояў, не было дадзена магчымасці рана пазнаёміцца з хрысціянскім вучэннем. Савецкія педагогі маглі быць выключна атэістамі, яны не мелі права афішаваць свае хрысціянскія погляды. Але, дзякуй Богу, многія настаўнікі і ў той час таемна хрысцілі сваіх дзяцей, не маючы магчымасці адкрыта наведваць храм. Мабыць, таму, нягледзячы на ўвесь запал атэістычнай прапаганды, большасць грамадства прытрымлівалася хрысціянскіх запаведзяў і не зракалася веры бацькоў. Аднак многія жыццёвыя сітуацыі лягчэй пераджыць, засвоіўшы з дзяцінства пастулаты хрысціянскага вучэння на роднай мове. Я мяркую, калі ў школьным узросце знаёміць дзяцей з тэкстамі Святога Пісання (найперш Евангелля) па-беларуску, гэта паспрыяе выхаванню ў моладзі гуманістычнага светапогляду і патрыятычных пачуццяў.

Я паглыбляюся ў тэкст Евангелля і нібы вяртаюся да самага пачатку жыцця чалавечага, калі многае з ужо спазнанага становіцца зразумелым, ясным і простым. Сваё адчуванне ад прачытання магу параўнаць з тым станам, які настае пасля глытка чыстай крынічнай вады ў спякотны дзень. Душа ўбірае ў сябе роднае Слова, якое было ў пачатку. Чыстая, зразумелая, простая без выкрунтасаў мова, з сапраўднымі формамі імёнаў святых, а не спрошчанымі ці адаптаванымі.

Дзякуй шчыры сапраўднаму падзвіжніку ў духоўным адраджэнні беларусаў, ксяндзу Уладыславу Завальнюку за выдатны прыклад служэння сваёй справе, за бясцэнны дар — кнігу на дарагой для кожнага беларуса мове.



**Дыктоўка беларускай мовы на офісе ТБМ. 10 верасня 2008 г.**

▸ **ПАРАЎНАННІ**

Пры ТБМ вось ужо два гады дзейнічаюць курсы беларускай мовы. Увосень 2008 года іх наведвала студэнтка са Швейцарыі Жанна Фроліхер, якая некалькі месяцаў была на стажыроўцы ў Беларусі. Жанна цікавіцца моўнымі працэсамі ў нашай краіне. Магчыма, гэта стане аб'ектам яе навуковага даследавання. На адным з заняткаў, падчас якога абмяркоўваліся праблемы двухмоўя на Беларусі, Жанна зрабіла кароткае паведамленне пра сваю радзіму — Швейцарыю. Нам падаецца, што чытачам «НЧ» будзе цікава даведацца з першых вуснаў пра стан шматмоўнасці ў гэтай еўрапейскай краіне.

# ШМАТМОЎНАЯ ШВЕЙЦАРЫЯ

*Жанна ФРОЛІХЕР, Швейцарыя*

**Швейцарыя — невялікая краіна, размяшчаецца паміж Італіяй, Аўстрыяй, Ліхтэнштэйнам, Германіяй і Францыяй. Насельніцтва краіны складае прыблізна 7 мільёнаў чалавек. Швейцарыя з'яўляецца федэральнай рэспублікай і складаецца з 26 кантонаў. У кожным кантоне ёсць свой урад, свая канстытуцыя, кантанальныя суды, розныя сістэмы адукацыі, правілы падатковай сістэмы.**

Упершыню прававы стан швейцарскага шматмоўя быў замацаваны Канстытуцыяй 1848 года. Нацыянальнымі мовамі былі прызнаны нямецкая, французская, італьянская. Рэтараманская мова была прызнана чацвёртай нацыянальнай мовай рэспублікі толькі ў 1938 годзе, дзякуючы палітычнаму ціску Раманскай Лігі.

Наяўнасць у Швейцарыі чатырох дзяржаўных моў зусім не сведчыць, што кожны швейцарац свабодна валодае імі.

Асноўная частка насельніцтва Швейцарыі (каля 64%) — нямецкамоўная, 19% насельніцтва размаўляе на французскай, 8% — на італьянскай і 1% — на рэтараманскай (романш) мовах. Зоны Швейцарыі не з'яўляюцца нязменнымі і аднастайнымі ў моўных адносінах адзінкамі, у месцах сыходжання моўных межаў ёсць зоны двухмоўя (напрыклад, Біль, Фрыбур, Берн). Натуральныя лінгвістычныя межы склаліся гістарычна і геаграфічна.

Кожная з чатырох моў мае мноства варыянтаў (у залежнасці ад раёна і кантона). Звычайна пра Швейцарыю кажуць, што гэта краіна, дзе існуе 4 мовы і 101 дыялект. У гэтай лінгвістычнай разнастайнасці здараецца, што часам жыхарам розных рэгіёнаў прасцей паразумецца з насельніцтвам суседніх краін, чым з суграмадзянамі. Так, напрыклад, мы з маім стрыечным братам з Жэневы размаўляем на англійскай, каб лепш разумець адзін аднаго.

У нямецкамоўнай частцы Швейцарыі склалася цікавая сітуацыя, якую лінгвісты называюць дыглосіяй, або дыялектналітаратурным двухмоўем. Гэта значыць, што мова, на якой мы гаворым дома або на вуліцы, моцна адрозніваецца ад нямецкай, на якой мы звычайна пішам і чытаем. Немцы, якія прыязджаюць у Швейцарыю, звычайна нічога не разумеюць, калі людзі размаўляюць на швейцарсканямецкай. Адрозніваюцца не толькі лексіка ці вымаўленне, але і граматыка. Ф. Дзюрэнмант, сусветна вядомы швейцарскі пісьменнік, у прыватнасці, пішa: «Я размаўляю па-бернску, а пішу па-нямецку. Я люблю бернскую, мову, якая ў многім пераўзыходзіць нямецкую. Гэта мая родная мова (Muttersprache)».

У побыце ўсе жыхары ў Швейцарыі прызвычаіліся да таго, што іх заўсёды акаляе тры або чатыры мовы. Напрыклад, на ўпакоўках надпісы робяцца на трох мовах, у цягніку прыпынкі абвяшчаюцца на нямецкай, французскай і італьянскай.

Кожны кантон сам вырашае, якая замежная мова, калі і як інтэнсіўна будзе выкладацца ў школе. Да цяперашняга часу ў нямецкамоўнай Швейцарыі першай замежнай мовай у школах з'яўляецца французская, у франкамоўнай частцы — нямецкая. Ва ўсіх школах у якасці другой замежнай мовы прапануецца англійская або італьянская.

Пры гэтым трэба зазначыць, што кожны швейцарац адчувае і называе сябе перш за ўсё швейцарцам, а не немцам, французам або італьянцам. Іншым разам па гэтай прычыне ўзнікаюць цікавыя сітуацыі. Я, напрыклад, жыву ў нямецкамоўнай частцы і, вядома ж, размаўляю па-нямецку. Аднойчы мы гулялі ў футбол з маладымі людзьмі з франкамоўнага горада. Трэба было неяк назваць і супрацьпаставіць каманды, і я сходу прапанавала: «Швейцарцы супраць французаў». Памятаю, яны моцна пакрыўдзіліся. Тое самае часам адчуваю і я. Мне непрыемна, калі нехта гаворыць, што я немка. Я — швейцарка.

У апошні час дыялект стаў больш моцным, таму што людзі больш гавораць, чым пішуць. А яшчэ людзі, асабліва маладыя, сталі актыўней абменьвацца sms, карыстацца e-mail, пры гэтым паведамленні і лісты пішуць на дыялекце, гэта значыць на нямецка-швейцарскай мове.

Сёння можна канстатаваць: у Швейцарыі кожная мова з'ява — як дыялект, так і нямецкая мова — знайшлі сваё месца ў грамадскім жыцці.

▸ **АБ'ЯВА**

Грамадскае аб'яднанне «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны» запрашае прыняць удзел у мерапрыемствах, прымеркаваных да 10-х угодкаў Міжнароднага дня роднай мовы, заснаванага па рашэнні ЮНЕСКА.

**21 лютага**

**Сядзіба ТБМ (Румянцава, 13) — агульнанацыянальная дыктоўка:**

1) 11.00 — першая група

2) 12.00 — другая група

**Палац Мастацтва (вул.Казлова, 3)**

14.00 — 16.00 — урачыстае пасяджэнне.

У праграме: уганараванне асоб, якія актыўна прапагандуюць беларускую мову ў сваёй прафесійнай і грамадскай дзейнасці; прэзентацыя грамадскіх ініцыятыў (стварэнне размоўніка); канцэртная праграма.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 20.02.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.